

**Паштальён-ардэнаносец**

СТАР. 3



**Трагедыя адной вёскі**

СТАР. 6



**Жыццё пад купалам**

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 112 (28222) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЗАКРЫТЫХ ТЭМ НЯМА

**Развіццё беларуска-кубінскіх адносін абмеркавана на ўчарашняй сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са спецыяльнымі прадстаўнікамі Фідэля Кастра.**

— Думаю, на Кубе не горш ведаюць, чым у Беларусі, што ў нас заўсёды былі і застаюцца самыя добрыя, брацкія адносіны, — заявіў Прэзідэнт Беларусі, дадаўшы, што ў нашай краіны ніколі не было закрытых тэм для супрацоўніцтва з Кубай. Так і застаецца на сённяшні дзень.

Адной з тэм сустрэчы сталі навуковыя распрацоўкі ў сферы сельскай гаспадаркі, паведамляе БЕЛТА. «Мы з вялікім задавальненнем гатовыя скарыстацца вашымі навуковымі даследаваннямі ў галіне раслінаводства і жывёлагадоўлі, каб гэта працавала не толькі на Кубу, але і на Беларусь», — сказаў Прэзідэнт.

Памочнік Фідэля Кастра Гільерма Льепіс Перэс таксама падкрэсліў выключна дружалюбны характар беларуска-кубінскіх адносін.

## РАЗВІЦЦЮ МЕДЫЦЫНЫ — ВЫКЛЮЧНАЯ ЎВАГА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям IX з'езда анколагаў і радыёлагаў СНД і Еўразіі, які будзе праходзіць у Мінску 15—17 чэрвеня.**

«Глыбока сімвалічна, што месцам правядзення гэтага форуму выбрана Беларусь, бо мы надаём развіццю медыцыны выключную ўвагу. Больш чым за 80 гадоў існавання айчынная анкалагічная служба ўстанавіла цесныя кантакты з медыкамі суседніх краін, а сёння жаданне прыняць удзел у з'ездзе выказалі і ўрачы з далёкага замежжа — Францыі, Вялікабрытаніі, ЗША, іншых дзяржаў», — гаворыцца ў прывітанні. Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што беларускія спецыялісты, як і іх калегі з-за мяжы, накіроўваюць асноўныя намаганні на выпрацоўку новых падыходаў да барацьбы з адной з самых сур'ёзных пагроз здароўю чалавецтва, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

## УСІМ ЛЫЖКАМ ЛЫЖКА!



**Бярэзінскія майстры вырашылі здзівіць свет... самай вялікай драўлянай лыжкай. На Бярэзіншчыне да нашага часу жывуць захавальнікі і прадаўжальнікі разьбярскай традыцыі, да таго ж тут стварылі адзіны ў Беларусі пакой-музей, экспанатам якога стала калекцыя драўляных лыжак.**

**Сваё рашэнне зрабіць незвычайную лыжку разьбяры патлумачылі тым, што ў свеце ёсць лыжка-гігант — у Румыніі, яе даўжыня 17 метраў. А яны могуць зрабіць і большую. Бярэзінскія лыжкары, а гэта Яўген ОСІПАЎ, Аляксандр ПАСКРОБКА і Уладзімір МАКАВЕЦКІ (на фота) вырашылі пераўзысці румынскіх разьбяроў і паставіць свой уласны рэкорд. З дапамогай леснікоў знайшлі ў лесе засохлы 25-метровы дуб, транспартавалі дрэва на двор Цэнтра рамёстваў і на працягу амаль паўгода выразалі гіганцкую лыжку ў выглядзе цмока. Па завяршэнні працы «цмока» палажылі на пастамент у выглядзе валуноў і перамералі. Атрымалася дваццаць тры метры і шэсцьдзесят шэсць сантыметраў. Рэкорд!**

**Работнікі Цэнтра рамёстваў заявілі, што маюць намер падаваць заяўку ў камісію па рэкордах краін СНД і Балтыі «Дзіва», а калі ўсё будзе добра, замахнуцца і на Кнігу рэкордаў Гінеса.**

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

***Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by.***

### *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір КАЛТОВІЧ, міністр гандлю:**

*«Цяпер можна пачуць пытанне: ці адчуюць нашы грамадзяне эфект ад стварэння Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, і калі так, то як хутка? На гэта можна адказаць так: верагодна, не адразу, але ў выніку, несумненна, адчуюць. Эфект для насельніцтва праявіцца ў зніжэнні цэн. Асноўная задача антыманапольнага органа — развіццё здаровай канкурэнцыі, якая ў канчатковым рахунку прывядзе да аптымальных суадносінаў «кошт-якасць». Але для таго, каб развіць канкурэнцыю, мы павінны стварыць роўныя ўмовы працы на рынку. Нельга рабіць прэферэнцыі адным у шкоду тром або чатыром. Перад законам усе прадпрыемствы роўныя. Пра гэта трэба памятаць і гэтым кіравацца».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20007,00 | ▲ |
| Еўра | 22509,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 303,01 | ▼ |
| Укр. грыўня | 802,85 | ▲ |

■ Ва ўрадзе

## ПРЫЯРЫТЭТ ДЗЯРЖАЎНАГА МАШТАБУ

**У новых эканамічных умовах Нацыянальная праграма падтрымкі і развіцця экспарту на 2016—2020 гады павінна стаць дзейсным інструментам, паведаміў учора прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, на якім разглядаліся вынікі работы па нарошчванні і дыверсіфікацыі экспарту.**

Паводле яго слоў, агульны тэмп росту экспарту тавараў і паслуг па прагнозе на 2016 год павінен скласці 103,5%, а за першы квартал — 101,1%. За чатыры месяцы года краіна мае тэмп росту на ўзроўні 83,9%. «Між іншым, трэба заўважыць, што ў колькасным выражэнні мы пастаўляем на экспарт больш, чым летась. Так, індэкс росту фізічнага аб'ёму экспарту за чатыры месяцы 2016 года да аналагічнага перыяду 2015 года склаў 102,2%. Гэта значыць, у натуральных велічынях тэмпы нашага экспарту маюць станоўчую дынаміку», — патлумачыў прэм'ер-міністр.

Падобная сітуацыя з экспартам назіраецца цяпер і на стратэгічным для Беларусі расійскім рынку. «У вартасным выражэнні мы маем тэмп росту на ўзроўні 93,6%, тады як фізічныя аб'ёмы павялічыліся на 5,9%. Але дзеля захавання канкурэнтаздольнасці на расійскім рынку нашым прадпрыемствам неабходна больш актыўна працаваць над зніжэннем сабекошту прадукцыі, што дасць магчымасць праводзіць больш гнуткую цэнавую палітыку», — лічыць Андрэй Кабякоў. Ён адзначыў, што ў Расіі і Казахстане актыўна ствараюцца вытворчасці, якія ў хуткім часе змогуць замясціць беларускія тавары. Менавіта таму кіраўнік урада запатрабаваў агучыць прапановы ад Мінэканомікі, МЗС, галіновых міністэрстваў, Нацыянальнай акадэміі навук наконт карэкціроўкі планаў па развіцці нацыянальных галін з дзеяннямі нашых асноўных гандлёва-эканамічных партнёраў па ЕАЭС.

Сітуацыя з экспартам цяпер складаная. Існуе адмоўная дынаміка па пастаўках беларускіх тавараў на еўрапейскім рынку. Значна скараціліся пастаўкі тавараў паліўна-энергетычнай групы, некаторых відаў металічных вырабаў, прадукцыі машынабудавання. Выклікае заклапочанасць і інфармацыя па экспарце ў Кітай. Цяпер адкрываецца рынак Ірана, з якога былі зняты санкцыі, а значыць, з'явіліся дадатковыя магчымасці, якія нашымі экспарцёрамі не выкарыстоўваюцца. Значна скараціліся пастаўкі і ў В'етнам, дзе адна з асноўных прычын — нізкі ўзровень дыверсіфікацыі экспарту. Амаль увесь аб'ём прыпадае на калійныя ўгнаенні і аўтамабілі. «Становішча неабходна выпраўляць, асабліва з улікам стварэння зоны свабоднага гандлю», — даручыў кіраўнік урада.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*




## ДЗЕЦІ ПАД НАГЛЯДАМ

### Як не азмрочыць летні адпачынак?

**Калі мы кажам пра дзіцячы траўматызм, то першая асацыяцыя, якая ўзнікае, — гэта трагічныя выпадкі на пажарах, утапленні, дарожна-транспартныя здарэнні, падзенні, атручэнні... Але чамусьці забываемся на тое, што атрыманая траўма для дзіцяці можа закончыцца групай інваліднасці. І тады якасць жыцця будзе кардынальна зніжана. Як жа зрабіць лета максімальна бяспечным?**



### СТВАРЫЦЕ РАДЫУС БЯСПЕКІ

— Давайце паглядзім на нядаўнія надзвычайныя здарэнні з удзелам дзяцей, — аналізуе сітуацыю галоўны спецыяліст упраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Міхаіл Батура. — Пад Бабруйскам у красавіку чатырохгадовы хлопчык гуляў ля разведзенага агню і зваліўся ў яго. Малы моцна апёк левую руку. У Смалявіцкім раёне вучань дзявятага класа распальваў на прыватным падворку вогнішча і выкарыстаў для гэтага бензін. На падлетку загарэліся штаны. Бацькі звярнуліся да ўрачоў толькі на наступны дзень...

Зараз па краіне праходзіць рэспубліканская акцыя «Канікулы без дыму і агню». Ратаўнікі прыходзяць з цікавымі навучальнымі праграмамі ў дзіцячыя садкі, прышкольныя летнікі. Дапамагаюць ім актывісты раённых і гарадскіх аддзяленняў Беларускай маладзёжнай грамадскай добраахвотнай арганізацыі ратаўнікоў-пажарных і студэнты-валанцёры.

Але на ратаўнікоў спадзявайся, ды і сам старайся.

СТАР. 5

■ Экспертыза

## ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ФАЛЬШЫВАК

**Дэнамінацыя прынясе нам не толькі новыя грошы. На думку экспертаў, у першыя часы пасля ўводу ў абарачэнне новых банкнот могуць узнікнуць некаторыя нязручнасці, чым лёгка скарыстацца махлярам і ашуканцам. Але што рабіць, каб гэтага не здарылася? Якіх банкнот трэба засцерагацца пры грашовых аперацыях? На гэтыя і другія пытанні ў размове з карэспандэнтам «Звязды» адказала Вольга Загароўская, старшая оперупаўнаважаная па асабліва важных справах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Міністэрства ўнутраных спраў.**

***— Як часта падрабляюць беларускія грошы?***

— У адрозненне ад нашых суседзяў, дзе пераважаюць падробкі нацыянальнай валюты, беларускія рублі падрабляюць не так часта. Мы найчасцей выяўляем фальшывыя амерыканскія долары, расійскія рублі і еўра. Фальшыўкі ў Беларусі амаль не вырабляюць. Іх пераважна прывозяць з-за мяжы. Нашы «ўмельцы» вырабляюць псеўдагрошы простым чынам — з дапамогай прынтара і камп'ютара. Могуць, напрыклад, да купюры прыляпіць яшчэ адзін нуль і павялічыць намінал банкноты. Часцяком гэтым займаецца моладзь, людзі, схільныя да ўжывання спіртнога і наркотыкаў. Фальшывыя беларускія рублі выглядаюць дрэнна, не маюць знакаў абароны. Пры добрым аглядзе вы зразумееце, што трымаеце ў руках падробку. Калі ў вас узнікаюць сумненні, вы можаце параўнаць банкноту з іншай. Але ні ў якім разе не абменьвайце фальшыўкі і не разлічвайцеся імі. Вашы дзеянні будуць расцэньваць як збыт падробных банкнот. Пакаранне строгае — да 15 гадоў пазбаўлення волі. Летась за падобнае злачынства асуджана 11 чалавек.

***— А ці былі сярод іх тыя, хто не ведаў, што мае справу з фальшыўкамі?***

— Не. У кожнага з іх быў намер. І кожны ведаў, што робіць забароненае. Аднак калі чалавек сумняваецца, лепш грошы прынесці адразу ў міліцыю і паведаміць, дзе іх атрымаў. Такім чынам праваахоўнікі здолеюць хутчэй знайсці крыніцу. У нас быў выпадак, калі мужчына за рускія рублі прадаваў аўтамабіль. Пасля вырашыў пакласці грошы на дэпазіт у банк, але яму паведамілі, што ўсе 385 тысяч расійскіх рублёў фальшывыя...

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ААН заклікала ЗША прыняць меры кантролю за абарачэннем зброі



ААН заклікала ЗША прыняць эфектыўныя меры кантролю за абарачэннем зброі ў краіне. Пра гэта заявіў Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека Зейд Раад аль-Хусейн, паведамляюць інфармагенцтвы. Аль-Хусейн, у прыватнасці, раскрытыкаваў «лёгкасць, з якой людзі могуць купіць зброю, у тым ліку штурмавыя вінтоўкі, нягледзячы на сваё крымінальнае мінулае, ужыванне наркотыкаў, здзяйсненне хатняга гвалту, псіхічныя расстройствы, а таксама прамы кантакт з экстрэмістамі». Пры гэтым камісар ААН назваў «безадказнай прапагандай» заявы пра тое, што зброя зробіць грамадства бяспечным. Ён таксама адзначыў, што вопыт краін, у якіх існуе жорсткі кантроль за набыццём і выкарыстаннем зброі, дэманструе зніжэнне злачыннасці.

### 900 чалавек шпіталізаваны ў Японіі з-за спякоты

Гарачыня і павышаная вільготнасць, выкліканая сезонам дажджоў, сталі прычынай шпіталізацыі каля 900 чалавек у Японіі. Смяротных зыходаў не зафіксавана, аднак у зоне рызыкі знаходзяцца людзі, старэйшыя за 60 гадоў. Медыкі рэкамендуюць насельніцтву піць больш вадкасці і пазбягаць знаходжання на адкрытым сонцы. Сіноптыкі папярэджваюць, што цяперашняе лета ў Японіі будзе гарачым з-за ўплыву кліматычных фактараў. У 2015 годзе ахвярамі спёкі ў Японіі сталі больш за 100 чалавек. Каля 53 тыс. былі шпіталізаваны.

### Таматы і кавуны могуць стаць выратаваннем для сардэчнікаў

Як паказалі даследаванні, у іх змяшчаецца пігмент лікапін, які аднаўляе пашкоджаныя захворваннямі сасуды і павялічвае іх праходнасць, паведамляе часопіс PLoS ONE. Амерыканскімі навукоўцамі быў праведзены эксперымент, у ходзе якога 36 здаровых людзей (кантрольная група) і 36 чалавек з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі прымалі альбо плацэба, альбо сродак, які змяшчае лікапін. У самым пачатку эксперыменту і ў яго канцы навукоўцы даследавалі праходнасць сасудаў добраахвотнікаў (адзін з маркераў сардэчна-сасудзістага здароўя). Аказалася, і ў хворых, і ў здаровых людзей, якія атрымлівалі прэпарат з лікапінам, праходнасць крываносных сасудаў павялічылася на 53%. Гэтыя высновы падмацоўвае статыстыка (людзі, якія актыўна спажываюць таматы і кавуны, радзей пакутуюць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў).

ISSN 1990 - 763X
16112

## КОРАТКА

**Беларусь — першая краіна ў гісторыі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, якая перайшла са статусу партнёра па дыялогу ў статус назіральніка.**

Савет па фінансавай стабільнасці створаны ў Беларусі. Яго ўзначалілі старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел Калаур і першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль Мацюшэўскі, намеснікі старшыні праўлення рэгулятара Дзмітрый Лапко і Дзмітрый Калечыц. Сярод асноўных задач савета — распрацоўка і каардынацыя выканання захадаў, накіраваных на забеспячэнне фінансавай стабільнасці.

**Нацыянальны аэрапорт «Мінск» увайшоў у дваццатку самых пунктуальных аэрапортаў Еўропы па версіі амерыканскага рэсурсу Flightstats, які адсочвае дакладнасць адпраўлення і прыбыцця рэйсаў.**

На вадаёмах краіны з пачатку купальнага сезона патанулі 15 чалавек: у Віцебскай вобласці — 2, Гомельскай — 1, Гродзенскай — 5, Мінскай — 4, Магілёўскай — 3. З іх 14 чалавек былі ў стане алкагольнага ап'янення.

**Вучоныя Беларусі і Галандыі выявілі ў нацыянальным парку «Прыпяцкі» новыя папуляцыі відаў раслін, уключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «...ПА ГАЗЕЦЕ МОЖНА ЎСПОМНІЦЬ ПЕСНЮ»

**Уладзімір Сідар, жыхар вёскі Шчэчыцы Мастоўскага раёна.**

«Звязду» я выпісваю гадоў з 25 ці 30, бо заўсёды знаходжу, што тут пачытаць. Дочкі часам кажуць, што можна падключыць інтэрнэт і тады газеты не трэба... Але ж да яго паспрабуй яшчэ прызвычайся, адшукай там... «Народ на провадзе!» ці «Хатнюю энцыклапедыю» з добрымі парадамі...

А тут — проста: разгарнуў і ўсё перад табою: хочаш — пра палітыку чытай, хочаш — пра спорт ці здароўе, хочаш — пра каханне. Па газеце нават песню можна ўспомніць ці вывучыць новую.

І мова ў «Звязды» адметная — наша, беларуская, прычым добрая. Такую цяпер няшмат дзе пачуеш, няшмат дзе ўбачыш. Амаль паўсюль нейкая трасянка, сумесь рускіх і беларускіх слоў...

А яшчэ мне падабаецца, што ў рэдакцыю можна пазваніць (ёсць нумары тэлефонаў) альбо напісаць. Мы вось у вёсцы доўга абураліся, чаму па тэлебачанні так позна паказваюць «Навіны надвор'я»... А ўрэшце я паскардзіўся ў газету і — з-за гэтага ці не з-за гэтага — але ж паказ перанеслі: была перадача ў 22.35 (а часцяком і куды пазней), а стала ў 20.40. І ўсе, каму трэба, могуць яе паглядзець...

Зрэшты, я не буду пералічваць усё, што мне падабаецца ў газеце. Я проста пры нагодзе ўсім кажу, што «Звязда» — гэта тое, што трэба: яе варта выпісваць.

***P.S.** Да чытача: вы лічыце акурат гэтак жа і хочаце расказаць, чаму? Калі ласка... Пішыце! І, вядома ж, выпісвайце...*

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА**

**5 разоў на тыдзень!**

**Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!**

**Падпісацца на газету можна самымі рознымі спосабамі (нават не выходзячы з дома). Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

■ Парламенцкі дзённік

# БАР'ЕРЫ ТРЭБА СТАВІЦЬ З РОЗУМАМ

**У парадку дня чарговага пасяджэння адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі сенатары разгледзелі 14 пытанняў. Адно з іх — ухваленне законапраекта «Аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва».**

Па словах **Мікалая КАЗАРАЎЦА, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці,** распрацоўка такога праекта закона звязана з неабходнасцю ўзгадненняў з патрабаваннямі нарматыўна-прававой базы Еўразійскага эканамічнага саюза. «Адно з новаўвядзенняў — вызначаны патрабаванні да аказання паслуг у сферы аграэкатурызму: тэрміны прыдатнасці, умовы захоўвання харчовых прадуктаў. Хачу адзначыць, што новыя, большыя правы цяпер будуць прадстаўляцца галоўнаму санітарнаму ўрачу Беларусі і яго намеснікам з мэтай павышэння эфектыўнасці нагляду над якасцю прадуктаў харчавання», — адзначыў парламентарый.

На думку **Ігара ГАЕЎСКАГА, прадстаўніка Міністэрства аховы здароўя,** усе патрабаванні ў сферы санітарна-эпідэміялагічнага кантролю павінны быць канструктыўна абгрунтаваныя. «Для гэтага неабходна ўвесці такое паняцце, як «ацэнка рызыкі». Яно ўжо часткова існуе, але законапраектам будзе ўдакладнена, — лічыць Ігар Гаеўскі. — З ухваленнем законапраекта Саветам Рэспублікі з'явіцца інструмент, які мы зможам выкарыстаць, калі нас будуць абвінавачваць у надуманых катэгорыях, бо цяпер абвінавачанні мусяць быць абгрунтаванымі, толькі калі рызыка для здароўя людзей будзе рэалістычнай». На яго думку, бар'еры ў агульнай эканамічнай прасторы павінны быць перш за ўсё разумовымі, не павінны стаць «тормазам для эканомікі», але і поўнае іх зняцце можа аказацца шкодным. Таму Ігар Гаеўскі прапануе падыходзіць да ўсяго рацыянальна і імкнуцца захаваць збалансаванасць падыходаў.

Большая частка ўхваленых членамі Савета Рэспублікі законапраектаў тычыцца міжнароднага супрацоўніцтва ў сферах бяспекі, мытні, турызму, падаткаў, медыцынскіх вырабаў. У тым ліку сенатары ратыфікавалі пратакол аб далучэнні Рэспублікі Арменія да Пагаднення аб адзіных прынцыпах і правілах абарачэння лекавых сродкаў, ухвалілі папраўкі ў шэраг законаў па барацьбе з тэрарызмам. Апошнім пытаннем стала датэрміновае спыненне паўнамоцтваў члена Савета Рэспублікі Ганны Шарэйкі, дырэктара Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі. Прысудам ад 10 чэрвеня бягучага года яна была прызнаная вінаватай па ч. 2 арт. 424 КК Беларусі. Па амністыі Ганна Шарэйка вызвалена і вінаватасць з яе знята. Тым не менш паўнамоцтвы члена Савета Рэспублікі здымаюцца з уступленнем у сілу абвінаваўчага прысуду.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# НОВЫ ДЗЕЛАВЫ ПАРТНЁР

## Дэлегацыя парламентарыяў з Афганістана наведала Мінск

**Гэта іх першы візіт у нашу сталіцу. Падчас сустрэчы з беларускімі калегамі госці з Афганістана адзначылі, што галоўная іх мэта — пазнаёміцца, завязаць першыя кантакты.**

— Беларусь ніколі не разглядала і не разглядае Афганістан як дзяржаву, ад якой зыходзіла б пагроза для нашых нацыянальных інтарэсаў, — заявіў **Віктар ГУМІНСКІ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.** — Хоць, вядома, некаторыя праблемы застаюцца. Перш за ўсё гэта наркатрафік, незаконная міграцыя. Але ў цэлым Беларусь бачыць у Ісламскай Рэспубліцы Афганістан свайго новага партнёра ў развіцці эканамічнага і іншага ўсебаковага супрацоўніцтва.

У той жа час, па словах віцэ-спікера Палаты прадстаўнікоў, наша краіна з болем назірае за актамі тэрарызму на тэрыторыі Афганістана.

— Вядома, са свайго боку ў рамках ААН робім усё магчымае, каб садзейнічаць мірнаму ўрэгуляванню працэсу, — звярнуў увагу Віктар Гумінскі. — Мы шчыра жадаем афганскаму народу міру і стабільнасці.

**Фархад САХІ ГУЛЯМ, віцэ-спікер Сената афганістанскага парламента,** сказаў, што ў Афганістане Беларусь добра памятаюць, як былую савецкую рэспубліку, якая пастаўляла ў яго краіну шмат тэхнікі.

— Мы памятаем вашыя трактары і іншае, што вы робіце ў Беларусі, — адзначыў парламентарый з Афганістана.

На сустрэчы з дэлегацыяй прысутнічалі прадстаўнік Аршанскага авіярамонтнага завода і дзяржаўнага знешнегандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Белспецзнештэхніка».

— Вы сказалі пра тэрарызм, наркотыкі... Мы стараемся справіцца з гэтым, ліквідаваць тыя недахопы, якія ёсць, — зазначыў віцэ-спікер Сената. — Але тэрарысты імкнуцца далей — у Сярэднюю Азію, нават на Каўказ.

Афганістанскі парламентарый адзначыў, што ў адзіночку яго краіне складана справіцца, неабходна падтрымка, у тым ліку з боку Беларусі і Расіі. Ён запрасіў беларускую парламенцкую дэлегацыю наведаць Афганістан.

Парламент Афганістана — Нацыянальная асамблея — складаецца з дзвюх палат: Валесі Джырга (палаты прадстаўнікоў) і Сената, які называецца Мешрана Джырга (палата старэйшын). Што цікава, прэзідэнт, прызначаючы сваіх прадстаўнікоў у верхнюю палату, павінен запрасіць не менш за двух прадстаўнікоў-інвалідаў і двух прадстаўнікоў ад ветэранаў. Не менш за 50% ад усёй колькасці сенатараў, якіх прызначае Прэзідэнт, павінны складаць жанчыны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**



# ЗАНЯТАСЦЬ, ЭКСПАРТ, ІНВЕСТЫЦЫІ

## У Магілёве дэлегаты пятага Усебеларускага сходу абмеркавалі вынікі працы за 5 гадоў і паставілі перад сабой новыя мэты

**Моладзь, прадстаўнікі ўладных структур, працоўных калектываў, ветэраны, кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, дэпутаты, навукоўцы, грамадскія дзеячы — 350 чалавек з ліку тых, кім ганарыцца Магілёўшчына, будуць прадстаўляць вобласць на 5-м Усебеларускім сходзе. Учора на сустрэчы ў аблвыканкаме падводзіліся вынікі таго, што зроблена ў вобласці за апошнія 5 гадоў, як далёка прасунулася яна ў сваім развіцці за гэты час.**



Фота БЕЛТА.

**Старшыня аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ** назваў найбольш значныя падзеі ў сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна за гэты перыяд. Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы маладых сем'яў у вобласці адчувальна палепшылася дэмаграфічнае становішча. На працягу 5 гадоў на Магілёўшчыне нарадзілася 60 тысяч немаўлят, а колькасць шматдзетных сем'яў павялічылася на 26% (8 тысяч). Правам на атрыманне сямейнага капіталу ў Магілёўскай вобласці скарысталіся каля 2 тысяч сем'яў. Вядома, што дабрабыт людзей наўпрост залежыць ад эканамічнага складніка. Прамысловай галіной Магілёўскай вобласці шмат зроблена па рэканструкцыі, тэхпераўзбраенні і мадэрнізацыі дзеючых вытворчасцяў з нарошчваннем іх магутнасцяў. «Магілёўхімвалакно», «Бабулін гладыш», «Магатэкс», «Магілёўліфтмаш», «Бабруйскаграмаш» — гэтыя і іншыя прадпрыемствы сёння паспяхова канкурыруюць на міжнародных рынках. Ёсць прыклады паспяховай дзейнасці прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу — Бялыніцкае СВК «Калгас «Радзіма», ЗАТ «Агракамбінат «Зара».

**Леанід МАІСЕЕЎ, поўны кавалер ордэнаў Айчыны, адзін з вопытных кіраўнікоў сельгасвытворчасці краіны,** які 35 гадоў працаваў генеральным дырэктарам агракамбіната «Зара» Магілёўскага раёна — той самы чалавек, да якога прыслухоўваюцца. Зараз гаспадаркай кіруе іншы чалавек, але Леанід Сяргеевіч па-ранейшаму ў курсе ўсіх спраў.

— Гаспадарка як была прыкладам для пераймання, так і застаецца, — кажа ён. — Тэмп росту валавой прадукцыі да ўзроўню мінулага года за 5 месяцаў склаў 113%. Кожны год, як бы ні было складана, ідзе прырост. Калі я прыйшоў працаваць у гаспадарку, яна атрымлівала 1000 тон мяса і 800 тон малака, цяпер — 13 тысяч тон мяса і 12 тысяч тон малака. Удой на карову складае 8 тысяч кілаграмаў за год. Паказчыкі як былі добрыя, так і засталіся. Мая мара была зрабіць гаспадарку з замкнёным цыклам вытворчасці. 7-8 апошніх гадоў «Зара» так і працуе. Мы атрымліваем добры хлеб, ураджайнасць якога дасягае не менш за 70 цэнтнераў з гектара, а месцамі даходзіць нават да 100. Маецца свой камбікормавы завод, які за месяц выпускае 3 тысячы тон камбікармоў. На ім мы вырошчваем тое самае мяса птушкі, свініны, ялавічыны. Маем свой міні-мясакамбінат, які кожны дзень адгружае Магілёву 10-12 тон прадукцыі. У абласным цэнтры сёння 32 нашы гандлёвыя пункты, дзе працуе 300 чалавек. І наша прадукцыя карыстаецца попытам.

Зараз увогуле робіцца стаўка менавіта на адданых сваёй справе людзей. І пра гэта шмат гаварылі на абласным сходзе. Абмяркоўваліся планы і задачы на наступную пяцігодку, кожны меў магчымасць выказаць сваё пажаданне. Старшыня Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір Цумараў нагадаў, што дзякуючы падтрымцы Прэзідэнта летась было адкрыта фінансаванне адной з галоўных транспартных артэрый Магілёва — Пушкінскага моста, дзе цяпер вядзецца актыўнае будаўніцтва. У горадзе за пяць гадоў паявіліся новыя дзіцячыя садкі, школа, на «Магілёўхімвалакно» за апошні час рэалізавана некалькі глабальных праектаў. Занятасць, экспарт, інвестыцыі — такія прэрагатывы мэр горада бачыць у будучыні.

**Аляксандр КАНАВАЛАЎ, кіраўнік сялянска-фермерскай гаспадаркі «Новы быт» Шклоўскага раёна** асоба, добра вядомая ў вобласці. Ён казаў аб сацыяльнай адказнасці бізнесу і неабходнасці падтрымкі дзяржавай прыватнай ініцыятывы. Для нарошчвання аб'емаў вытворчасці трэба пашырыць магчымасць крэдытавання фермерскіх гаспадарак і спрасціць працэдуру прадастаўлення крэдытаў Банкам развіцця», — падкрэсліў ён. Старшыня Чавускага райсавета дэпутатаў Анатоль Мацюлін звярнуў увагу на неабходнасць урэгулявання заканадаўства па спарахнелых дамах. Гэтыя і іншыя прапановы будуць перададзены ў рэспубліканскі аргкамітэт Усебеларускага сходу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ФАЛЬШЫВАК

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Ці чакаеце, што пасля дэнамінацыі будзе ўсплёск грашовых падробак?***

— Мы чакаем не ўсплёску, а невялічкага пагаршэння сітуацыі. Мяркую, беларускія падробкі таксама з'явяцца. Праўда, да гэтага мы гатовыя. Пасля мінулай дэнамінацыі, якая адбылася ў 2000 годзе, адчуваўся рост падобных злачынстваў. Працэнт фальшывых беларускіх рублёў быў вялікім. Зламыснікі звычайна старыя грошы выдавалі за новыя, а нехта збываў прыдуманыя купюры наміналам 500 рублёў, разлічваўся імі ў прыдарожных кавярнях, крамах. Што цікава, касіры верылі, прымалі іх за сапраўдныя. Новыя беларускія грошы дастаткова абароненыя. Падрабіць іх складана. Але я дапускаю, што за шэсць месяцаў, пакуль у абарачэнні адначасова будуць і старыя, і новыя грошы, злачынцы змогуць надрукаваць падробкі старых. І тая блытаніна, якая, магчыма, будзе першыя часы, можа ім пасадзейнічаць.

**Сёлета ў Беларусі зафіксавана звыш 360 выпадкаў фальшываманецтва.**



***— Чаму ў крамах можа ўзнікнуць неразбярыха?***

— Таму што прадаўцам прасцей працаваць з грашыма аднаго ўзору, пластыкавымі карткамі. Пакуль яны будуць пералічваць грошы, можа, забудуцца праверыць іх на сапраўднасць. Пры гэтым мы актыўна супрацоўнічаем з работнікамі гандлю, праводзім з імі растлумачальныя размовы наконт дэнамінацыі. А ў інструкцыях Нацбанка нават запісана, што прадаўцы купюры павінны правяраць. Калі яны гэтага не робяць, прапускаюць фальшыўкі, за гэта прадугледжана адміністрацыйная адказнасць.

***— Ці згодныя з тым, што першыя беларускія падробкі будуць дрэннай якасці?***

— А яны, паўтаруся, усе дрэннай якасці. Надрукаваны кропельна-струйным прынтарам на звычайнай паперы. Фарба пад уздзеяннем вады размываецца, пры пераломе купюры абсыпаецца, вадзяных знакаў няма. Тым не менш такія купюры прапускаюць у крамах. Пасля дэнамінацыі людзям трэба будзе быць вельмі пільнымі. Галоўнае — ведаць новыя грошы, з якімі можна пазнаёміцца на спецыяльных плакатах, а таксама не пускаць да сябе ашуканцаў, якія могуць прапанаваць іх абмяняць. Так здарылася ў Лунінцы, дзе дзяўчына вымантачыла ў пенсіянера 16 мільёнаў рублёў. Раскажыце пра гэта і сваім старым. Мяняць грошы афіцыйна можна будзе толькі з 1 ліпеня.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

■ Падпіска-2016

# РУШЫМ У АШМЯНЫ!

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

Пераскочыў праз «экватар» першы месяц лета, а нашы сустрэчы з чытачамі ўпэўнена перайшлі на другі дзясятак. Звяздоўцы пабылі ва ўсіх абласцях, прычым у розных кутках Беларусі. Кожная з сустрэч запомнілася надоўга (спадзяёмся, што такое ж ураджанне і ў гасцінных гаспадароў), прынесла журналісцкі плён у выглядзе тэм для далейшых публікацый, была багатая на падзеі і цікавых, шчырых людзей. Ну і падпісчыкаў у «Звязды» падчас такіх сустрэч заўважна пабольшала. Думаем, што ніколькі не расчаруем нашых чытачоў. Як гэта ўжо робім, дарэчы, цягам амаль стагоддзя.

Сустрэчы з чытачамі працягваюцца. Заўтра накіроўваемся на Гродзеншчыну — у непаўторны Ашмянскі раён, апеты класікамі (пэўна, памятаеце караткевіцкі «Чорны замак Альшанскі»). Думаем, нашы чаканні спраўдзяцца. Дзень падпісчыка «Звязды» адбудзецца 16 чэрвеня з 11 да 14 гадзін на раённым вузле паштовай сувязі. Завітайце — будзе цікава!

■ Факт

# ЭКСПАРТ ПАЧАЎ ПАВЯЛІЧВАЦЦА

**Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, за чатыры месяцы года ў параўнанні з аналагічным перыядам летась экспарт тавараў у натуральным выражэнні павялічыўся на 2,2%, а імпарт скараціўся на 2,8% пры зніжэнні сярэдніх цэн экспарту на 20,2%, імпарту — на 11,4%.**

У Белстаце паведамляюць, што ў студзені—красавіку знешнегандлёвы абарот тавараў у нашай краіне склаў 15 115,2 млн долараў ЗША, у тым ліку экспарт — 6 926,8 млн, імпарт — 8 188,4 млн долараў. Да ўзроўню адпаведнага перыяду летась (у дзейных цэнах) абарот знешняга гандлю таварамі склаў 84%, калі доля экспарту скарацілася амаль на 18%, а імпарту — на 14%.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# БЫВАЙ, СЯБРА. ТЫ ЗАСТАЕШСЯ СЯРОД ЗВЯЗДОЎЦАЎ

**Пайшоў з жыцця ветэран газеты «Звязда», выдатны фотажурналіст, надзейны і шчыры калега Мікалай Амельчанка**



На гэтым фотаздымку Мікалай Амельчанка такі, якім быў роўна два месяцы таму. Я прыехаў наведаць яго, і размова адразу ж пайшла пра справы ў рэдакцыі, дзе ён працаваў на працягу трох дзесяцігоддзяў. «Звязда» ў пачатку сямідзясятых гадоў стала для яго, маладога выпускніка журфака Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, месцам здзяйснення творчых задум, прафесійных здольнасцяў. На той час у беларускай прэсе ён быў, відаць, адзіным фотакарэспандэнтам, які меў вышэйшую (пры тым сталічную!) адукацыю, і гэты высокі ўзровень заўжды адпавядаў высокай якасці яго працы.

Як вызначаецца якасць зробленага фотажурналістам? Спытайцеся ў мільёнаў людзей, якія амаль за пяцьдзясят гадоў творчасці Мікалая Амельчанкі разглядалі ў беларускіх газетах зробленыя ім фотаздымкі, чыталі яго рэпартажы, нарысы. Ён заўжды заставаўся шчырым і прынцыповым, працаваў аператыўна, дакладна. Спытайцеся у вялікага мноства людзей, якім ён дарыў свае фотаздымкі — такіх добра і малазнаёмых з ім вельмі шмат (ад славутых касманаўтаў да сціплых вясковых працаўнікоў). Спытайцеся у тых, каму пашчасціла пабываць на яго фотавыставах — Мікалай даносіў да гледачоў цудоўныя краявіды Беларусі, знаёміў з яе славутасцямі, расказваў пра свае падарожжы у іншыя краіны. Лёс даў Мікалаю працаваць у вельмі складаны, вызначальны час. Ён заўжды з годнасцю выконваў свой прафесійны абавязак — заставаўся на перадавой лініі галоўных падзей.

Вяртаючыся да прыведзенага тут фотаздымка, заўважу: Мікалай заўжды ганарыўся сваім рэдакцыйным калектывам. Паглядзіце, у якіх вялікіх альбомах захоўваў ён свае звяздоўскія публікацыі. Гэтыя творчыя архівы мы разглядалі не раз: яны поўняцца подыхам нашай гісторыі, захоўваюць цеплыню рук выдатнага майстра.

Бывай, дарагі наш сябра і калега. Тым, з кім побач ты працаваў, вельмі цяжка казаць развітальныя словы.

**Яўген ПЯСЕЦКІ і астатнія звяздоўцы.**

■ Акцэнты

# ПЛЁННАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ

## Міністры ўнутраных спраў Расіі і Беларусі сустрэліся ў Гомелі падчас аб'яднанай калегіі праваахоўных ведамстваў Саюзнай дзяржавы

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС РБ, Ігар Шуневіч і яго расійскі калега Уладзімір Калакольцаў абмеркавалі пытанні ўзаемадзеяння ў сферы барацьбы з арганізаванай злачыннасцю, а таксама ўзмацненне супрацоўніцтва органаў унутраных спраў у ахове грамадскага парадку і супрацьдзеяння злачыннасці на транспарце.



Ігар Шуневіч адзначыў, што сістэмныя, доўгатэрміновыя сумесныя дзеянні праваахоўных органаў Беларусі і Расіі па вядучых напрамках аховы правапарадку, якія носяць папераджальны характар, мусяць быць скіраваны на аб'яднанне высілкаў супраць рэальнага маштабу крыміналізацыі грамадства. Сярод прыярытэтных напрамкаў працы ведамстваў — забеспячэнне асабістай і маёмаснай бяспекі.

Узаемадзеянне беларускіх і расійскіх праваахоўнікаў прыносіць плён. Так, наша міліцыя ў інтарэсах расійскай паліцыі за апошнія два гады затрымала 345 абвінавачаных, знойдзены 31 без вестак зніклы чалавек. У сваю чаргу супрацоўнікі органаў унутраных спраў Расіі затрымалі больш за 700 асоб, якіх абвінавачваюць у здзяйсненні злачынстваў і вышукваюць у нашай краіне. Летась падчас міжведамаснай аператыўна-прафілактычнай аперацыі «Канал» у Беларусі з незаконнага абарачэння канфіскавана 13,8 кілаграма наркотыкаў. На тэрыторыі Расіі — звыш 82 кг розных відаў, 361 адзінка зброі, больш 40 кг узрыўчаткі.

**Якаў ЖУРБІН**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ПРАДАЁМ ШКЛО Ў ПОЛЬШЧУ І ГЕРМАНІЮ, А ШЧЭБЕНЬ — У РАСІЮ

**Паводле інфармацыі прэс-службы Мінбудархітэктуры, за чатыры месяцы аб'ём экспарту беларускіх будаўнічых матэрыялаў павялічыўся на 4,8% у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам і склаў 86,4 млн долараў.**

Такой станоўчай дынамікі галіна дасягнула ў першую чаргу за кошт істотнага павелічэння экспарту шкла, чаму ў значнай меры паспрыяў дагавор на пастаўкі шкла паміж акцыянерным таварыствам «Гомельшкло» і буйной кампаніяй з Германіі. Дагаворам прадугледжана паставіць у Польшчу і Германію каля 8,5 млн квадратных метраў шкла. Дарэчы, сёлета за студзень — красавік гэтага матэрыялу ў Польшчу пастаўлена на 71,8% больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

Важкі ўклад у прырост знешнегандлёвых паказчыкаў унеслі і экспартныя пастаўкі шчэбню. Дэфіцыт гэтага тавару на рынку Расіі і павышаны попыт на беларускі шчэбень павялічыў яго экспарт у расійскія рэгіёны амаль у 3 разы. У плюсе апынуліся і айчынныя вытворцы вапны, экспарт якой павялічыўся сёлета адразу на 10%.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## МОГУЦЬ КАНФІСКАВАЦЬ УЖО ТРЭЦЯЕ АЎТО

**Таксіст з Ваўкавыскага раёна з-за нелегальнага возніцтва можа пазбавіцца ўжо трэцяга аўтамабіля.**

Паводле інфармацыі інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Гродзенскай вобласці, жыхар раёна трэці раз трапіў у поле зроку з-за ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці без дзяржаўнай рэгістрацыі і ліцэнзіі. Ён нелегальна аказваў паслугі па перавозцы пасажыраў па маршруце Ваўкавыск — гарпасёлак Рось. Падчас кантрольнай «закупкі» кіроўца ўзяў ад супрацоўніка падатковай інспекцыі 50 тысяч рублёў.

Кіроўца з 2009-га па 2015 год ужо пяць разоў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за нелегальнае возніцтва. У яго былі канфіскаваныя два аўтамабілі агульным коштам каля 100 мільёнаў рублёў, а таксама накладзена штрафаў на суму каля 10 мільёнаў рублёў.

Цяпер таксісту прад'яўлены да выплаты адзіны падатак у памеры 4,1 мільёна рублёў, падлічаны з выкарыстаннем павышальнага каэфіцыента 5. Парушальніку можа пагражаць штраф у памеры да 21 мільёна рублёў. Апроч таго, ён можа пазбавіцца ўжо трэцяга па ліку аўтамабіля (коштам каля 80 мільёнаў).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ 2016 ГОДА. ЦЯПЕР У СЕРАБРЫ І НІКЕЛІ

**Нацыянальны банк Беларусі пачынае выпуск у абарачэнне памятных манет «Алімпійскія гульні 2016 года. Веславанне на байдарках і каноэ».**



Больш дарагая манета гэтай серыі зроблена з серабра і мае намінал 20 рублёў. Агульны тыраж выпуску складае 750 штук. Медна-нікелевая мае намінал 1 рубель і адчаканена тыражом 2000 штук.

Манеты маюць форму круга. Яны адчаканены ў акцыянерным таварыстве «Літоўскі манетны двор». Сярэбраныя манеты выкананы якасцю «пруф», а медна-нікелевыя — «пруф-лайк».

Выпушчаныя ў абарачэнне манеты з'яўляюцца законным плацежным сродкам Беларусі, абавязковым да прыёму па намінальным кошце пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў. І пасля 1 ліпеня памятныя манеты Нацбанка будуць прымацца ў якасці плацежнага сродку менавіта па намінале.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ГАНДЛЯВАЛІ СТАРЫМ АБУТКАМ

**У сталіцы тры падлеткі арганізавалі ўласны «бізнес»: пад выглядам новых красовак высылалі пакупнікам паношаны абутак.**

— Аднаму з фігурантаў справы толькі споўнілася 18 гадоў, двум іншым было па 17. Разбагацець яны вырашылі пры дапамозе ўласнай кемлівасці. У сацыяльнай сетцы стварылі старонку пад выдуманым імем, на якой размясцілі фотаздымкі красовак вядомых брэндаў, — расказала прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля Ганусевіч. — Каб прыцягнуць увагу пакупнікоў, яны ўказвалі цэны, ніжэйшыя за рынкавыя. Прычым самога тавару ў іх не было. Калі пакупнік заказваў жаданае, аплачваў пакупку па пошце (грошы пералічваліся на паўналетняга зламысніка), хлопцы адпраўлялі пасылку з паношаным абуткам. Пасылкі «бізнесмены» рассылалі па ўсёй краіне. Пра маштаб занятку сведчыць той факт, што за вечар яны планавалі да дзясятка адпраўленняў. Пакуль у міліцыю звярнуліся чацвёра пацярпелых, але ёсць падставы меркаваць, што іх нашмат больш. Заведзена крымінальная справа, хлопцам пагражае тэрмін пазбаўлення волі да чатырох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАЙШЛІ, ПАЙШЛІ КЛУБНІЦЫ!

**Нядаўняе пахаладанне крыху прыпыніла паступленне на прылаўкі клубніц, ды і буйных ягад было не так шмат.**



— Палепшала надвор'е — і пайшлі клубніцы, здаюць масава і машын шмат, — паведамілі ўчора ў Лунінецкім раённым спажывецкім таварыстве. — Апошніх і на мінулым тыдні было шмат, але фактычна сезон толькі пачаўся. Сёння так званую таварную ягаду здавалі па 15-23 тысячы рублёў за кілаграм. Закупачны кошт на такія клубніцы рэгулюе попыт-прапанова. Што тычыцца іншых катэгорый, нядаўна на іх былі зацверджаны закупачныя цэны: для вінаробства — 3 тысячы рублёў за кілаграм, для кансервавання — 5 тысяч рублёў за кілаграм.

## СПРАБАВАЛА З'ЕСЦІ... ПРАТАКОЛ

**Некалі Аркадзь Укупнік абяцаў у песні з'есці перад ЗАГСам свой пашпарт. У сталіцы аўтамабілістка нападпітку спрабавала зрабіць тое ж самае з адміністрацыйным пратаколам, які на яе склалі супрацоўнікі ДАІ. Range Rover, якім кіравала жанчына, меў расійскія нумары.**

Супрацоўнікі АДАІ Маскоўскага РУУС патрулявалі раён, калі каля 4 гадзін раніцы заўважылі гэты аўтамабіль. Ён ехаў на высокай хуткасці, пятляў і перастройваўся з паласы ў паласу. Дзяржаўтаінспектары паспрабавалі спыніць транспартны сродак , але гэта адбылося толькі пасля прыцягнення на дапамогу яшчэ двух экіпажаў. Кіроўцам машыны апынулася жанчына, якая паводзіла сябе не зусім адэкватна: мела хісткую паходку, невыразнае маўленне, пах алкаголю, які адчуваўся на адлегласці. Ад праходжання медыцынскага агляду кіроўца адмовілася, абражала супрацоўнікаў ДАІ і медработнікаў. А калі на яе афармлялі пратакол, вырвала яго і спрабавала з'есці, пры гэтым выказвала намер укусіць супрацоўнікаў. Цяпер аўтамабіль знаходзіцца на штрафстаянцы, сама жанчына — у міліцыі.

## ДАДАТКОВЫ АВІЯРЭЙС У АДЭСУ

**З 16 чэрвеня па 28 кастрычніка авіякампанія «Белавія» ўводзіць дадатковы рэйс па маршруце Мінск — Адэса — Мінск.**

Выкананне дадатковага рэйса запланавана тры разы на тыдзень на самалётах Boeing 737-300 у двухкласнай кампаноўцы. Такім чынам, «Белавія» будзе лятаць у Адэсу дзесяць разоў на тыдзень. Дадатковыя рэйсы будуць вылятаць з Мінска па панядзелках, серадах і пятніцах у 00.20, а прылятаць у Адэсу ў 01.40. Зваротныя рэйсы будуць адпраўляцца з Адэсы ў 03.30, а прыбываць у Мінск у 04.55.

Як адзначылі ў авіякампаніі, Адэса прымае каля 3,5 мільёна турыстаў у год пры патэнцыяле ў 2,5 раза больш. На дадзены момант уладамі горада і вобласці зроблена шмат па прыцягненні нашых землякоў для адпачынку ў рэгіёне: даступны шырокі спектр паслуг ад «зялёнага» да медыцынскага турызму па дэмакратычных цэнах. Сёлета прагназуецца павялічэнне колькасці беларусаў, якія выберуць Адэсу месцам адпачынку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

КАНТАКТ
№ 3 (37)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»
Сумесны выпуск з РУП «Белпошта»



■ Падпіска-2016

# «У ВАС ТОЛЬКІ ХЛЕБА НЕ ХАПАЕ»

## Паштавікі забяспечваюць сваіх кліентаў не толькі цікавымі выданнямі, але і разнастайнымі бытавымі таварамі

**У Дзераўнянскае аддзяленне паштовай сувязі паступае больш за тысячу розных перыядычных выданняў. Гэтае аддзяленне адно з першых актыўна ўключылася ў падпісную кампанію на другое паўгоддзе 2016-га. Наведвальнікаў на пошце нямала з самай раніцы, і кожнаму з іх паштавікі не забываюць прапанаваць цікавыя выданні: для сябе, дзяцей, усёй сям'і. У каталогу такі шырокі выбар газет, часопісаў, што можна нават разгубіцца. Але работнікі пошты гатовы дапамагчы і падказаць, што выбраць, бо і самі лічацца аднымі з найбольш актыўных падпісчыкаў.**

Начальнік аддзялення Антаніна Жодзік і аператар Вераніка Яўсейчык рыхтуюць стэлаж для свежых выданняў, якія рэалізуюцца ў розніцу. Жанчыны ў прывабнай уніформе з сінімі фірменнымі гальштукамі (такі «дрэс-код» заведзены на пошце год таму), на беласнежных блузках прымацаваны бэйджыкі.

**У кожнага з іх свой стол, маршрут, аднак усіх іх яднае тое, што яны добра ведаюць людзей і што людзі з нецярпеннем іх чакаюць.**



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

**Перад выездам паштальёны *(злева направа)*: Вольга САЙ, Яніна КАНАПАЦКАЯ, Наталля КУЗЁМКА і Вікторыя ЧЭМКА.**

Антаніна Жодзік працуе ў аддзяленні дзевяць гадоў. Пачынала аператарам, а ў 2013-м пасля выхаду на заслужаны адпачынак ветэрана паштовай сувязі Валянціны Калошыч замяніла яе на пасадзе начальніка аддзялення. Сёння аддзяленне актыўна прапануе жыхарам аграгарадка і суседніх сельскіх населеных пунктаў новыя віды паслуг, выконвае даведзеныя планавыя заданні, працуе па новых камп'ютарных тэхналогіях. Напрыклад, устаноўлены счытвальнік для ажыццяўлення аперацый па безнаяўным разліку. Летась у аддзяленні быў зроблены касметычны рамонт.

На вызваленае Антанінай Жодзік аператарскае месца прыйшла Вераніка Яўсейчык. З камп'ютарам яна на «ты», таму цяжкасцяў у рабоце не ўзнікае. Свой добры настрой маладая жанчына і, дарэчы, мама двух дзяцей, тлумачыць яшчэ і зручнасцю месца працы: маўляў, дзіцячы садок акурат па дарозе на работу.

Працоўная раніца дазваляе заспець на рабочым месцы і паштальёнаў. Іх у аддзяленні чацвёра. Усе — жанчыны.

Неўзабаве са Стоўбцаў прыязджае машына з белай дыяганальнай паласой. Чуецца вокліч-сігнал: «Пошта прыйшла!» Разам з ёй прыбыў і розны тавар, які неабходна хуценька разгрузіць.

— Напярэдадні я зрабіла заяўку, заказ аказаўся вялікім, — тлумачыць Антаніна Жодзік і свае словы падмацоўвае лічбамі: — Тавараабарот аддзялення складае ў месяц у сярэднім каля 40 мільёнаў рублёў.

Тавары паўсядзённага попыту часткова будуць рэалізаваны непасрэдна ў аддзяленні паштовай сувязі (побач з ім — дзіцячая школа мастацтваў, жылы пасёлак, таму сюды ахвотна забягаюць і дзеці, і дарослыя, якія жартуюць: «У вас толькі хлеба не хапае»). Астатняе паштальёны развязуць сваім падпісчыкам, кліентам на службовым транспарце — веласіпедзе. У гэту цёплую пару года ён аблягчае іх працу.

Пасля разгрузкі паштовай машыны ў паштальёнаў яшчэ адзін важны абавязак — сарціроўка пошты. Адбываецца яна ў асобным памяшканні з шыльдай «Пакой паштальёна». У кожнага з супрацоўнікаў свой стол. І свой, зразумела, маршрут, аднак усіх іх яднае тое, што яны добра ведаюць людзей, і што людзі з нецярпеннем іх чакаюць.

— Мне і сёння ўжо тэлефанавалі жыхары, цікавіліся ў колькі прыеду, таму што хочуць аплаціць камунальныя паслугі, — кажа Наталля Кузёмка. — Людзі навокал добрыя, ветлівыя, — прызнаецца Наталля Іванаўна, сама ўраджэнка Валожынскага раёна. Шмат пастаянных кліентаў і ў яе вопытнай калегі шматдзетнай маці Яніны Канапацкай, у зоне абслугоўвання якой участковая бальніца, а таксама вёска Агароднікі. У «свайго» паштальёна з людзьмі вельмі цесныя і даверлівыя адносіны. «Ведаю нават, у каго якія праблемы», — дзеліцца Яніна Генадзьеўна.

«Людзям часта хочацца пагаварыць, нешта расказаць», — падзялілася са мной Вікторыя Чэмка, бадай, самы вопытны работнік аддзялення. З дня ў дзень ідзе яна не толькі да жыхароў Дзераўной, але і вёсак Барок , Барок-1, Зарэчча. Усюды паспявае. Непрыкметна і двое яе дзяцей выраслі — ужо ўнукаў маюць бабуля з дзядулем.

Самая маладая ў аддзяленні — Вольга Сай, пры тым што стаж яе работы ў раённым вузле паштовай сувязі дзесяць гадоў. Увесь час яна працавала ў аддзяленні ў Старыне, а пасля яго закрыцця пераведзена паштальёнам у Дзераўную. Пакуль працуе на паўстаўкі, але матулю двух дзяцей абяцалі забяспечыць работай. Энергічная Вольга ідзе насустрач жыхарам Дружнай, дзе жыве яе сям'я і якіх цяпер абслугоўваюць шляхам мотадастаўкі, па-ранейшаму дапамагае ім з прыёмам камунальных плацяжоў, дастаўкай тавару.

**Таццяна ГЕОРГІЕВА,**
*Стаўбцоўскі раён*

# ЯК НАНОЎ НАРАДЗІЛАСЯ

**Учора ў Добрушы пасля мадэрнізацыі адкрыўся будынак адноўленага раённага вузла паштовай сувязі. Цяпер ён пафарбаваны ў традыцыйныя сіне-блакітныя колеры і будынак відаць здалёк.**



З моманту ўводу ў эксплуатацыю, а гэта 36 гадоў таму, раённы вузел паштовай сувязі працаваў без правядзення капітальнага рамонту. Сёлета за кошт уласных сродкаў (а гэта Br5,5 млрд) была праведзена мадэрнізацыя будынка: зроблены новы фасад, заменены аконныя блокі, добраўпарадкавана тэрыторыя побач, прыведзены да нарматываў сістэмы цепла- і электразабеспячэння.

Як расказала начальнік Добрушскага РУПС Алена Трубкіна, у аддзяленні паштовай сувязі №4 арганізавана пяць працоўных месцаў аператараў у паштовай зале, дзе можна ўнесці плацяжы і скарыстацца ўсімі паслугамі, якія прадстаўляюцца РУП «Белпошта». Таксама створана шэсць участкаў дастаўкі, якія абслугоўваюць больш за 10 тысяч чалавек. Аддзяленне паштовай сувязі абсталявана ўсімі неабходнымі тэхнічнымі і праграмнымі сродкамі, а таксама аплатна-даведачным тэрміналам, з дапамогай якога можна самастойна ўнесці розныя плацяжы без камісіі.

У дзень урачыстага адкрыцця прайшла акцыя «Дзень чытача». Падчас яе ўсім кліентам, якія аформілі падпіску на газеты ці часопісы, быў уручаны памятны падарунак. Таксама супрацоўнікі аддзялення падрабязна расказалі кліентам пра розныя спосабы афармлення падпіскі: у аддзяленні паштовай сувязі, на аплатна-даведачным тэрмінале, праз паштальёна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# ГАЗЕТА ДАПАМАГАЕ... НАВАТ АД ФІТАФТОРЫ

## Паштальён з Магілёва — пра асаблівасці сваёй прафесіі і прыхільнікаў «Звязды»

**«З тоўстай сумкай на рамяні» Галіна Хаўратовіч ходзіць па Магілёве амаль 8 гадоў. Раней пра прафесію паштальёна нават не марыла, працавала на заводзе «Электрарухавік». Але аднойчы скарацілі, і прыйшлося кардынальна мяняць сваё жыццё.**



Жанчына прыйшла ў 30-е, цэнтральнае, аддзяленне паштовай сувязі і з таго часу там працуе. Спачатку было цяжка: падпіскай займацца, пенсіі разносіць, карэспандэнцыю дастаўляць. Вуліцы Ленінская, Першамайская, Піянерская... З 8 гадзін раніцы і да 15.00 круцішся як у віры. Так набегаешся, што ног пад сабой не адчуваеш. Добра яшчэ, што не трэба кожны раз вяртацца ў аддзяленне па чарговую партыю прэсы. Выданні на машыне дастаўляюць бліжэй да месца распаўсюджвання і пакідаюць у спецыяльных скрынях. А паштальён потым бярэ і разносіць па кватэрах.

Трапіць у пад'езд таксама не заўсёды атрымліваецца з першай спробы. Не кожны яшчэ дзверы адчыніць. Але Галіна не перажывае. Не пашчасціла з адным жыхаром, пашчасціць з іншым. Вось каму трэба спачуваць, дык гэта яе вясковым калегам, лічыць яна. Ім даводзіцца «задобрываць» злых сабак, мець справы з так званымі асацыяламі — у сельскай мясцовасці іх хапае.

Ад пастаяннай хады па дамах і кватэрах адзенне і абутак хутка робяцца непрыгоднымі. Але паштальёнаў забяспечваюць не толькі сумкамі для прэсы. «За 8 гадоў працы я знасіла адзін казённы плашч, 3 целагрэйкі і 8 пар туфляў, — смяецца Галіна. — Больш трывалыя зімовыя боты, яны цёплыя і іх надоўга хапае. Модніцам, магчыма, яны б і не спадабаліся, але ў іх вельмі зручна». А яшчэ паштальёнам выдаюць індывідуальныя сродкі абароны — свісткі і газавыя балончыкі. На шчасце, прымяняць усё гэта пакуль не даводзілася. Хоць яе калегі траплялі ва ўсялякія гісторыі. Год таму ў Шклоўскім раёне нейкі зламыснік напаў на паштальёна проста ў аддзяленні, ударыў так, што жанчына страціла прытомнасць. На шчасце, яна хутка ачуняла і адразу ж патэлефанавала ў міліцыю. Зламысніка затрымалі «па гарачых слядах». А яшчэ на аднаго паштальёна напалі ў Магілёве, проста ў пад'ездзе. Жанчына, праўда, не разгубілася і змагла пастаяць за сябе.

На ўсялякі выпадак Галіна засвоіла пару сілавых прыёмаў, якія паказаў ім на занятках кіраўнік па тэхніцы бяспекі. На практыцы не прыходзілася гэтага рабіць, але абавязкова скарыстаецца, калі спатрэбіцца.

Не праходзіць дарам і хаджэнне з цяжкай сумкай на плячы. Баляць не толькі ногі, але і спіна. Паштальёнка марыць, каб нарэшце сумкі замянілі на заплечнікі. Было б лягчэй спраўляцца. Асабліва цяжка ў «гарачыя дні» — сераду і пятніцу, калі выходзіць шмат тоўстых штотыднёвікаў. Затое ў панядзелак можна крыху расслабіцца — у гэты дзень газет няма.

Газеты, часопісы, лісты, пенсіі, тэлеграмы — паштальён дастаўляе ўсё гэта без перапынку на абед і нават амаль без выхадных. Адзін дзень, калі ён можа адпачыць ад спраў — нядзеля. У вольны час Галіна любіць пасядзець на беразе Дняпра з вудай. Лепш за ўсё клюе вечарам або раніцай гадзін у 5-6, з веданнем справы кажа яна. Звычайна кампанію ёй складае муж. А вось у дачкі іншыя інтарэсы.

Нягледзячы на ўсе складанасці, Галіне прафесія падабаецца. Стараецца папулярызаваць выданні, бо ад колькасці падпісчыкаў і заробак залежыць. Але не кожны ідзе на ўгаворы. Усе спадзяванні на тых, якія зацягваюць паясы тужэй, але не здраджваюць любімай газеце. Ёсць такія і сярод падпісчыкаў «Звязды». «Адзін ветэран, колькі я працую, толькі і выпісвае гэту газету, — кажа Галіна. — Аднойчы спрабаваў памяняць на іншую, але хутка вярнуўся да знаёмых аўтараў. Ды і па беларускай мове паспеў засумаваць».

**А яшчэ паштальёнам выдаюць індывідуальныя сродкі абароны — свісткі і газавыя балончыкі. На шчасце, прымяняць усё гэта пакуль не даводзілася. На ўсялякі выпадак Галіна засвоіла пару сілавых прыёмаў, якія паказаў ім на занятках кіраўнік па тэхніцы бяспекі.**

— За апошнія 8 гадоў попыт на газеты і часопісы значна зменшыўся, — заклапочана Галіна. — Цяпер людзі абмяжоўваюцца 1-3 выданнямі, хоць раней выпісвалі адразу 7-8. Тое ж самае адбываецца ў арганізацыях і на прадпрыемствах. Апошнім часам яны сталі вельмі эканоміць на прэсе. Магчыма, праблема ў тым, што не існуе ўжо такіх форм папулярызацыі, як палітінфармацыя, калі ўсе грамадска-палітычныя навіны разглядаліся і абмяркоўваліся разам. А той кароткай рэкламы, якая гучыць з дынамікаў радыё і экранаў тэлевізараў, не хапае. Раней рабіліся і так званыя агляды газет. Усё гэта спрацоўвала. Зараз людзі пераарыентаваліся на забаўляльныя выданні, дзе галоўныя падзеі — свецкая хроніка і парады, як зрабіць сябе яшчэ прыгажэйшым. Або больш цікавяцца вузкімі, ведамаснымі. Міліцыя, напрыклад, чытае «На страже», медыкі — «Медицинский вестник».

Напаследак Галіна прыводзіць яшчэ адзін аргумент на карысць газет. Аказваецца яны вельмі добра дапамагаюць... ад фітафторы. «Я, напрыклад, пасля прачытання пад памідоры іх кладу — і ўраджай атрымліваецца на славу!» — кажа яна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# Працаўніца, актывістка, мама дзесяцярых дзяцей

**Ну што ў нас за жанчыны такія: прыгожыя, разумныя, і пры гэтым такія сціплыя! Сядзім паўгадзіны, няспешна размаўляем з паштальёнам Інай ШУЛЬГАН пра кліентаў, падпісчыкаў, дастаўку, іншыя нюансы яе нялёгкай работы, а пра сябе яна амаль ні слова, толькі «так», «не». Як тут здагадаешся, што перад табой — гераіня. У прамым сэнсе слова. Добра, што калегі падказалі. Іна не проста кавалер ордэна Маці, яна — маці дзесяцярых дзяцей. І пры гэтым Іну Уладзіміраўну называюць адным з лепшых працаўнікоў 13-га аддзялення паштовай сувязі Брэста.**



Сапраўды ў яе становішчы самым важным уяўляецца ўменне ўсё паспяваць. Пяцёра дзяцей Іны Шульган, старэйшаму з якіх 26 гадоў, ужо самастойныя, зарабляюць сабе на хлеб, 17-гадовая Віка толькі што адсвяткавала выпускны баль, трое — школьнікі, меншы Стасік рыхтуецца восенню стаць першакласнікам.

**Іна пералічвае сваіх найбольш цікавых кліентаў. Сярод іх ветэран вайны 92-гадовы Ісаак Манастырскі. Выпісвае заўсёды не менш за чатыры газеты: рэспубліканскую, абласную, адну маскоўскую, ну і яшчэ што-небудзь.**

— Дзеці мне не ў цяжар, — разважае Іна. — Мы з мужам заўсёды хацелі мець вялікую сям'ю. Ён ва ўсім дапамагае. Калі доўга на працы затрымліваюся, можа і вячэру прыгатаваць, і ўрокі ў дзяцей праверыць. Работа ў сям'і не дзеліцца на жаночую і мужчынскую. Да таго ж дзеці апякаюць адно аднаго, старэйшыя дапамагаюць малодшым. Так усё пакрысе ідзе сваім парадкам.

Яшчэ маці вялікага сямейства расказала, што жывуць яны ва ўласным доме, які ў свой час дапамаглі будаваць іх бацькі з абодвух бакоў. А дзяржава падтрымала шматдзетную сям'ю кватэрай, у якой цяпер жывуць старэйшыя дзеці. Усе яны выраслі працавітымі, адказнымі. Усе скончылі альбо вучацца ў музычнай школе. Некалі Іна прайшла курс музыкі ў школе па класе фартэпіяна. Вось сыны і дочкі ўзялі ў спадчыну ад маці цікавасць да музыкі. І яна гэтаму вельмі рада.

У 1999 годзе Іна Шульган атрымала ордэн Маці, было гэта пасля нараджэння пятага дзіцяці. Каляжанкі яе пажартавалі, што трэба вылучаць жанчыну на другі ордэн. Бывалі ж раней двойчы Героі Сацыялістычнай Працы, напрыклад. А мацярынства ў дзясятай ступені гэта і ёсць каласальная праца. Як кажуць, у кожным жарце...

Хоць, як ужо гаварылася, Іна Уладзіміраўна і на асноўнай рабоце ў першых шэрагах. Штодзень яна ходзіць па сваім даволі вялікім участку з цяжкай сумкай. Паводле яе слоў, вельмі адказная работа — гэта дастаўка пенсій. На дастаўку грашовых выплат афармляюць, як правіла, самых сталых людзей. А тыя ўжо чакаюць, рыхтуюцца да прыходу паштальёна дні за два. І з кожным трэба пагаварыць, пацікавіцца здароўем, паслухаць іх расповеды.

Іна пералічвае сваіх найбольш цікавых кліентаў. Сярод іх ветэран вайны 92-гадовы Ісаак Манастырскі. Вайну прайшоў ад званка да званка, надта інтэлігентны чалавек, вельмі ўважлівы. Можа многа расказаць пра мінулае. Напрыклад, калі выйшаў на экраны фільм «Ліквідацыя», пра пасляваенную Адэсу ён расказваў, здавалася, яшчэ цікавей, бо жыў там у канцы 40-х. Выпісвае заўсёды не менш за чатыры газеты: рэспубліканскую, абласную, адну маскоўскую, ну і яшчэ што-небудзь. Адным словам, цікавіцца ўсімі падзеямі ў свеце.

Ёсць нямала адзінокіх жанчын, якім паштальён Іна ў вызначаны дзень прыносіць пенсію. І вось якім назіраннем падзялілася яна: «Перажываю, калі даводзіцца чытаць у газетах альбо чуць пра адзінокіх старых, пакінутых уласнымі дзецьмі. Гэта найгоршая загана грамадства. Не ведаю, ці так супала, ці ў нашым горадзе наогул лепшае становішча, толькі на маім участку няма забытых састарэлых людзей. Некаторыя пражываюць адзінока, але дзеці іх даглядаюць, праяўляюць клопат, што адразу прыкметна, як толькі заходзіш у кватэру. І гэта мяне радуе».

Падпісчыкаў сваіх Іна ведае асабіста. Адны прывыклі плаціць адразу за тры месяцы, альбо паўгода, іншыя — працягваюць кожны месяц. Трэба толькі своечасова напамінаць. Паводле яе назірання, у «Звязды» падпісчыкі пастаянныя. Адзін з іх, напрыклад, жыве па вуліцы Чырванасцяжнай. Выданне атрымлівае больш за 20 гадоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# САМА САБЕ НАЧАЛЬНІК

## У глыбінцы паслугі «Белпошты» адпавядаюць сучаснаму ўзроўню, а іх спектр у вёсках не адрозніваецца ад гарадскога

**На Шуміліншчыне нашаму карэспандэнту пашчасціла пазнаёміцца з прафесіяналамі ў сферы паштовых паслуг з вялікай літары. Начальнік аддзялення ў вёсцы Дабея Вольга НЕСЦЯРЭНКА паспяхова выступіла на прафесійным конкурсе — яна ў «топавым спісе» па вобласці. Акрамя таго, яна адначасова і паштальён.**



Вольга Савельеўна на сваім «пасту» — у аддзяленні паштовай сувязі ў Дабеі з 8.00 да 12.30 і з 15.30 да 17.00 гадзін. А калі яе няма ў памяшканні пошты пасярод рабочага дня, значыць яна ў вёсцы. Усяго абслугоўвае больш за 540 чалавек!

— Нядаўна ў Віцебску на галоўным паштамце адбыўся абласны конкурс прафесійнага майстэрства. Спачатку журы трэба было прадставіць асабістую прэзентацыю. Канкурсанты творча распавядалі пра працоўныя будні. Было і тэсціраванне, і практычныя заданні. Я зрабіла адпраўленне «Па шляху» з дакументамі, аформіла страхоўку на аўто. Пры гэтым трэба было вызначыць сапраўднасць дакументаў. Акрамя таго, адправіла электронны грашовы перавод за мяжу — у Расію... Па выніках нялёгкіх выпрабаванняў, бо ўсе канкурсанткі былі моцныя ў прафесійным плане, заняла 8-е месца, — падзялілася яна ўражаннямі.

Абаяльная жанчына аказвае паштовыя паслугі ў Дабеі і населеным пункце Прыазёрны. Маё пытанне, як жа яна спраўляецца з такім вялікім «фронтам работ», — выклікала ў жанчыны ўсмешку. Сказала, што любіць сваю работу, таму і спраўляецца адна. За ўсе гады скаргаў не было. Галоўнае — усё ведаць дасканала і загадзя планаваць працоўны час.

— Ва ўсім паспее той, хто, як кажуць, ад «а» да «я» ведае сакрэты прафесійнага майстэрства. Мой агульны паштовы стаж прыкладна гадоў 10. Раней працавала паштальёнам. Каля 3-х гадоў — на цяперашняй пасадзе. Так, яна вельмі адказная. Землякі і госці раёна ведаюць, што пошта працуе надзейна круглы год. І пры самым капрызным надвор'і ім акажуць паштовую паслугу, — гаворыць Вольга.

У асноўным у аддзяленне прыходзяць, каб адправіць ліст ці пасылку, купіць тавары штодзённага попыту, аплаціць камунальныя паслугі, мабільную сувязь... Калі пералічваць усё, што можна зрабіць у гэтым утульным памяшканні, бадай, не хопіць газетнай старонкі. У наш час пошта — «шматпрофільны сэрвісны цэнтр», дзе аказваюць дзясяткі паслуг. Напрыклад, можна заказаць тавары беларускіх вытворцаў (па каталогу), аформіць страхоўку, аплаціць за кватэрны тэлефон... І якасць, аператыўнасць абслугоўвання — высокія, незалежна ад месцазнаходжання аддзялення паштовай сувязі.

— Сярод кліентаў ёсць і адзінокія. Напрыклад, 90-гадовая бабулька часта просіць харчовыя тавары прынесці. А ў нас дастаткова багаты выбар і прымальныя цэны. Можаце параўнаць кошт цукру, напрыклад, макаронных вырабаў, кансерваў, — працягвае Вольга.

Пенсіянеркі любяць яе, як дачку. І вельмі сумуюць, калі яна ў адпачынку. Але, канешне, пошта працуе і ў гэтыя дні. Бо Вольгу падмяняе «дублёр».

Удвая прыемна пісаць менавіта пра Вольгу і таму, што яе свякроў — падпісчыца «Звязды» з вялікім стажам. Любоў Васілеўна Несцярэнка наогул любіць чытаць беларускамоўныя выданні і кнігі. Ёсць упэўненасць, што і 6-класнік, яе ўнук, сын Вольгі, таксама будзе паважаць роднае слова. Хлопец вучыцца ва ўнікальнай гімназіі ў Ляскавічах.

Калі ёсць трохі вольнага часу, яна шые вопратку сабе і сваякам. Вучылася ў Віцебску ў індустрыяльна-педагагічным каледжы. Мае дыплом майстра вытворчага навучання і тэхнолага. Але звязала сваё працоўнае жыццё з поштай і не шкадуе. Бо і праца прэстыжная, і штодня служыць людзям — для яе гонар. Робіць усё, каб яе кліентам заўсёды было што чытаць, каб своечасова атрымлівалі лісты, адчувалі сабе літаральна на сувязі з усім светам.

На памяць шаноўнай Вользе і яе свякрыві перадаў фірмовыя падарункі ад «Звязды». Не забыў пакінуць і сувеніры для іншых падпісчыкаў старэйшай дзяржаўнай беларускамоўнай газеты.

Нагадаю, у наступным годзе «Звяздзе» споўніцца 100 гадоў! І заўсёды падчас камандзіровак хочацца ўбачыць тых, хто агітуе за наша выданне, выпісвае яго. У Шумілінскім раёне такіх дзясяткі!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

*Шумілінскі раён.*

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторного аукциона | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «Белсантехмонтаж-2», г. Минск, ул. Брилевская, 15 |

**Предмет аукциона**

**Лот №1**

**Продаже на аукционе одним лотом подлежат объекты недвижимого имущества в составе:**

| Наименование | Назначение | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| Здание АБК (составные части: подвал) общ. пл. 1 423,5 м кв. | Здание административно-хозяйственное | 400/С-75196 | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б |
| Проходная, общ. пл. 20,1 м кв. | Здание неустановленного назначения | 400/С-90975 | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б/1 |
| Склад горюче-смазочных материалов, общ. пл. 49,1 м кв. | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 400/С-90973 | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б/2 |
| Материально-технический склад (составные части: навес, платформа, платформа), общ. пл. 46,5 м кв. | | 400/С-90977 | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б/3 |
| Материально-технический склад с мастерскими (составные части: пристройка), общ. пл. 736,6 м кв. | | 400/С-90982 | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б/7 |
| Подкрановые пути | Сооружение специализированное железнодорожного транспорта | | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б |
| Благоустройство территории | Сооружение благоустройства | | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б |
| Сведения о земельном участке: | Площадь: 1.0296 га; Вид права: предоставлен на праве постоянного пользования; Целевое назначение: эксплуатация и обслуживание зданий и сооружений. | | |

**Начальная цена с НДС 20 % – 15 501 374 016 белорусских рублей.**
**С учетом деноминации – 1 550 137 руб. 41 коп.**

**Лот №2**

| Наименование | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|
| Здание административно-бытового корпуса с гаражами, общ. пл. 391 кв. м | 612/С-749 | Минская область, г. Жодино, ул. Барсуковская, д. 9 |

Обременения: аренда части гаража пл. 70,4 кв. м
Срок действия договора – по 30.09.2016.

**Сведения о земельном участке:** Площадь (га): 0.2045. Целевое назначение: Для обслуживания производственной базы филиала «Борисовское монтажное управление». Вид права: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования.

**Начальная цена с НДС 20 % – 409 941 000 белорусских рублей.**
**С учетом деноминации – 40 994 руб. 10 коп.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи:** ***По Лоту №1* – 5 (пять)** рабочих дней после регистрации продавцом в установленном законодательством порядке подкрановых путей и благоустройства территории. ***По Лоту №2* – 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона.

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

*Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» по Лоту №1 - 20.04.2016 г., по Лоту №2 - 07.04.2016 г.*

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | **27.06.2016 в 14 ч. 00 мин по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| Дата и время окончания приема документов | **24.06.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| Контактные телефоны: | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |



| | |
|---|---|
| **Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:** | **- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)**<br>**- организации и проведению аукционных торгов**<br>**- инвентаризации и оценке зеленых насаждений** |

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:**
**27 июня 2016 г. в 11.00 состоится ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**
по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бакалея Бобруйск» (продавец), в составе (предмет торгов):

**ЛОТ № 1** (предмет торгов) - Комплекс зданий и сооружений, расположенный по адресу: Могилевская обл., Кировский р-н, Стайковский с/с, д.Чигиринка, около д. Чигиринка в квадрате № 108 Чигиринского лесничества Государственного лесохозяйственного учреждения «Бобруйский лесхоз», в составе:

кап. строение с инв. № 712/С-31071 (домик № 1) общ. пл. 49,8 кв. м; кап. строение с инв. № 712/С-31072 (домик № 2) общ. пл. 49,0 кв. м; кап. строение с инв. № 712/С-31073 (здание электрощитовой) общ. пл.1,5 кв. м; кап. строение с инв. № 712/С-31074 (здание столовой) общ. пл. 42,0 кв. м; кап. строение с инв. № 712/С-31075 (здание уборной), общ. пл. 2,0 кв. м; кап. строение с инв. № 712/С-31076 (ограждение); кап. строение с инв. № 712/С-31077 (линия наружного освещения); кап. строение с инв. № 712/С-31078 (кабельная линия); кап. строение с инв. № 712/С-31079 (колодец мелкотрубчатый); трансформаторная подстанция КТП – бывшая в эксплуатации

| | |
|---|---|
| **Продавец предмета торгов** | ОАО «Бакалея Бобруйск», УНП 700161263 ОКПО 01569601, 213805, г. Бобруйск, ул. Ново-Шоссейная, 39А, р/с 3012787310019 в ОАО «Белинвестбанк» ЦБУ №831 г. Бобруйск Гол.ф-ла по Могилев. обл., код 712 |
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 153001369 |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369, УНП 102353509 |
| **Начальная цена предмета торгов и размер задатка** | 446 969 000 рублей без учета НДС, размер задатка – 10% от начальной цены – 44 697 000 рублей |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 722583208101000001 расположен по адресу: Могилевская обл., Кировский р-н, Стайковский с/с, д. Чигиринка, около д. Чигиринка в квадрате № 108 Чигиринского лесничества – Государственного лесохозяйственного учреждения «Бобруйский лесхоз», площадь – 0,3881 га предоставлен для обслуживания существующих зданий и сооружений базы отдыха «Чигиринка». Имущественные права на земельный участок – право аренды. Правообладатель – ОАО «Бакалея Бобруйск». Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земли, находящиеся в водоохранных зонах и прибрежных полосах водоемов |
| **Характеристика предмета торгов** | |
| домик № 1 – одноэтажный, сборно-щитовой, фундамент – кирпич, перекрытия деревян, кровля шиферная, полы дощ., имеется терраса, электричество и отопление печ.; домик № 2 – одноэтажный, сборно-щитовой, фундамент – кирпич, перекрытия деревян., кровля шиферная, полы дощ., имеется терраса, электричество и отопление печ.; здание электрощитовой – одноэтажное, 1981 г.п., фундамент – кирпич., стены кирпичные, перекрытия отсутствуют, кровля шифер., полы бетон.; здание столовой – одноэтажное, 1981 г.п., фундамент – кирпич., стены кирпичные, перекрытия ж/б, кровля совм., полы бетон., имеется электричество и отопление, газоснабжение, навес; здание уборной с кирпичным выгребом – одноэтажное, дощат., 1981 г.п., фундамент – кирпич., стены дощат., перекрытия отсутствуют, кровля – шифер, полы дощатые; ограждение – сетка рябица, протяженность – 266,51 м, метал. ворота – 4,17 м, метал. калитка – 0,95 м; линия наружного освещения протяженность 37,7 м; кабельная линия – подземная линия электропередач низкого напряжения 10 кВ, протяженность 166,8 м; колодец мелкотрубчатый – глубина скважины 20 м, насос – бытовой электрический, 2002 г. п.; имеется трансформаторная подстанция КТП, бывшая в эксплуатации | |
| **Условия продажи** | При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20% |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов |
| **Срок и условия оплаты за предмет торгов** | Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов для участия в торгах, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | По 23 июня 2016 г. до 16.00 |

Победитель (Претендент на покупку) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

*****Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» от 09 апреля 2016 г.***

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами **по телефонам: 8 (0225) 72-01-32, 72-13-93, 8 (044)710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Витебские продукты», 210041, г. Витебск, ул.Воинов-Интернационалистов, 25, тел. +375 29 711-18-95.

| |
|---|
| **Лот №1.** Изолированное помещение с инв.№200/D-94455 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Московский, д. 64 площадью 1213,1 кв. м, наименование: магазин, назначение: торговое помещение. Нач.цена (до/после деноминации): 10 936 000 000/1 093 600 рублей без НДС. Задаток (до/после деноминации): 1 093 600 000/109 360 бел. руб. |
| Лот №2. Изолированное помещение с инв.№200/D-94452 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Московский, д. 16 площадью 798,5 кв. м, наименование: магазин, назначение: торговое помещение. Нач.цена (до/после деноминации): 9 755 000 000/975 500 рублей без НДС. Задаток (до/после деноминации): 975 500 000/97 550 бел. руб. |
| Повторный аукцион состоится 01.07.2016 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 15.06.2016 с 8.30 по 30.06.2016 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и затраты по оценке имущества. Обременение лота №2: договор аренды части помещения площадью 223 кв. м сроком до 21.03.2019. |

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копию документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр.статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ.лица или индивидуального предпринимателя - доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г.Витебск, ул.Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Первое извещение опубликовано в газете «Рэспубліка» 06.05.2016. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества**

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

| |
|---|
| **Продавец:** Открытое акционерное общество «Витебские продукты», 210041, г. Витебск, ул.Воинов-Интернационалистов, 25, тел. +375 29 711-18-95. |
| **Лот №1.** Право на заключение договора аренды сроком на 3 года части изолированного помещения (инв. №200/D-94450) площадью 31,5 кв. м на 1 этаже по адресу: г. Витебск, пр-т Московский, 32 (здание магазина). Размер ежемесячной арендной платы: 28,35 базовых арендных величин.<br>**Целевое использование:** объект по оказанию услуг населению (кроме ритуальных услуг), офиса, объекта торговли непродовольственными товарами (в т.ч. аптеки).<br>**Начальная цена:** 1 071 000/107,10 бел. руб.<br>**Размер задатка:** 107 000/10,70 бел. руб. |
| **Лот №2.** Право на заключение договора аренды сроком на 3 года части изолированного помещения (инв. №200/D-111004) площадью 30,5 кв. м на 1 этаже по адресу: г. Витебск, пр-т Московский, 76, пом. 71 (здание магазина). Размер ежемесячной арендной платы: 27,45 базовых арендных величин.<br>**Целевое использование:** объект по оказанию услуг населению (кроме ритуальных услуг), офиса, объекта торговли непродовольственными товарами (в т.ч. аптеки).<br>**Начальная цена:** 1 037 000/103,70 бел. руб.<br>**Размер задатка:** 104 000/10,40 бел. руб. |
| **Лот №3.** Право на заключение договора аренды сроком на 3 года частей капитального строения (инв. №200/С-52276) площадью 22,4 кв. м на 1 этаже по адресу: г. Витебск, ул. Лазо, 8 (здание магазина). Размер ежемесячной арендной платы: 16,13 базовых арендных величин.<br>**Целевое использование:** объект по оказанию услуг населению (кроме ритуальных услуг), офиса, объекта торговли непродовольственными товарами (в т.ч. аптеки).<br>**Начальная цена:** 761 600/76,16 бел. руб.<br>**Размер задатка:** 76 200/7,62 бел. руб. |
| **Лот №4.** Право на заключение договора аренды сроком на 3 года частей капитального строения (инв. №200/С-52276) площадью 41,7 кв. м на 1 этаже по адресу: г. Витебск, ул. Лазо, 8 (здание магазина). Размер ежемесячной арендной платы: 30,02 базовых арендных величин.<br>**Целевое использование:** объект по оказанию услуг населению (кроме ритуальных услуг), офиса, объекта торговли непродовольственными товарами (в т.ч. аптеки).<br>**Начальная цена:** 1 417 800/141,78 бел. руб.<br>**Размер задатка:** 142 000/14,20 бел.руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 18.07.2016 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».<br>**Срок внесения задатка и подачи документов:** с 15.06.2016 с 8.30 по 15.07.2016 до 17.30.<br>Начальная цена и размер задатка указаны до/после деноминации. |

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр.лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос.регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г. Витебск, ул. Ленина, 17, УНП 390477566.

**Контактный тел. (0212) 42-61-62,**
**e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторного аукциона | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | ОАО «Белоозерский энергомеханический завод», Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Заводская, 1 |
| **Предмет аукциона** | |
| **1. Теплица** (назначение – здание специализир. растениеводства) с инв. номером 120/С-14941, пл. **12 913,7 кв. м** | |
| Составные части и принадлежности: быт. помещение 386,7 кв. м, навес для тары 374 кв. м, пункт учета тепла 8,2 кв. м, наруж. сети канализации 407 м, наруж. сети водопровода 1003 м, наруж. сети теплоснабжения 2083 м, водозаборные сооружения, дороги и площадки 7940 кв. м, насос. станция 38,9 кв. м, отстойник, два забора 2138 кв. м, кабельные линии электроснабжения 680 м, наруж. освещение 510 м, наруж. слаботочные сети 720 м, ТП 30 кв. м | |
| **2. Здание котельной для отопления зимних блочных теплиц** (назначение – здание специализир. иного назначения) с инв. номером 120/С-20794, пл. 223,1 кв. м | |
| Составные части и принадлежности: линия электропередач 105 м, сети водопровода 11 м, сети канализации 70 м, теплосети 109 м, труба дымовая, склад топлива 107 кв. м | |
| В состав предмета аукциона входит **оборудование** в количестве 16 единиц (в соответствии с перечнем оборудования, размещенного на сайте организатора аукциона www.cpo.by) | |
| **Месторасположение: Брестская обл., Березовский р-н, Белоозерский с/с, д. Нивки** | |
| **Сведения о земельном участке:** предоставлен продавцу для обслуживания теплиц на праве постоянного пользования пл. 6,7317 га. Ограничения (обременения): участок пл. 0,0632 га находится в охранных зонах линий электропередачи | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 2 621 074 397 белорусских рублей (снижена на 80%) (с учетом деноминации – 262 107 рублей 44 копейки)** | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 15 рабочих дней после проведения аукциона |

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано газете «Звязда» от 01.06.2016.

**Дата и время проведения аукциона: 28.06.2016 в 14 ч. 00 мин. по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Заводская, 1, ОАО «Белоозерский энергомеханический завод».**

**Дата и время окончания приема документов: 27.06.2016 до 17 ч. 00 мин. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71.**
**Email: auction@cpo.by**




# ДЗЕЦІ ПАД НАГЛЯДАМ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

— Мы рэкамендуем бацькам, бабулям і дзядулям вызначыць для малых так званы радыус небяспекі, — раіць памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях Віталь Навіцкі. — Яго велічыня прама залежыць ад узросту малога. Чым ён старэйшы, тым небяспекі больш. Вакол дома, дзе малы бавіць больш часу, самыя распаўсюджаныя фактары рызыкі — гэта незакрытыя калодзежы, вадаёмы, разнастайныя лясныя масівы і дарогі. Па магчымасці іх неабходна ліквідаваць, напрыклад прыбраць у пуню сельскагаспадарчыя прылады, замкнуць падвалы, дзверы. Калі ж патэнцыйную небяспеку ўяўляе аб'ект, на які паўплываць непасрэдна не атрымліваецца, то абавязкова трэба сесці і абгаварыць гэта з малым. І, на маю думку, праводзіць лікбез патрэбна з дзецьмі ўсіх узростаў.



## ГРУПА РЫЗЫКІ — ДА ПЯЦІ ГАДОЎ

Спецыялісты прааналізавалі вынікі і прычыны дзіцячага траўматызму. Па іх падліках, за пяць гадоў дзяцей стала гінуць па розных прычынах удвая меней. І гэта можна назваць калектыўным поспехам усіх зацікаўленых ведамстваў.

— Але нас насцярожвае адна заканамернасць: гібель дзяцей ва ўзросце да пяці гадоў застаецца, па сутнасці, нязменнай, — гаворыць загадчыца лабараторыі РНПЦ «Маці і дзіця» Таццяна Гнядзько. — І калі з дзецьмі старэйшага ўзросту мы працуем вельмі актыўна, каб да іх дастукацца, то бяспечны свет ранняга дзяцінства — гэта прэрагатыва ў першую чаргу бацькоў. Яны і адказваюць за дзіця, якое развіваецца і спазнае свет. Малы ва ўзросце ад паўтара да двух гадоў пачынае ўсведамляць, што прадметы вакол яго існуюць незалежна. Гэта выклікае ў яго надзвычайную цікавасць да іх. Плюс дзеці любяць капіраваць паводзіны бацькоў. А калі нагляд за імі па розных прычынах аслабляецца, то малых і цягне на рызыкоўныя «подзвігі».

Спецыялісты па выніках назірання апошніх гадоў вылучаюць некалькі «гарачых кропак». На прысядзібным участку гэта вельмі папулярныя цяпер надзіманыя басейны, якія дарослыя пакідаюць адкрытымі. Для сталага чалавека яны небяспекі не ўяўляюць, а для двухгадовага дзіцяці гэта прыцягальны аб'ект, з якога ён можа ўжо і не выбрацца.

Невідавочнай на першы погляд пагрозай з'яўляюцца садовыя арэлі. Іх або дрэнна мацуюць пры мантажы, або пры набыцці не ўлічваюць узрост дзіцяці. І, як вынік, пад большай вагой яны разлятаюцца падчас палёту. Ды і пра наваколле гушкалкі таксама трэба паклапаціцца: прыбраць усё каменнае і металічнае.

Яшчэ адно месца небяспекі — вокны. У аўтара гэтых радкоў дагэтуль стаяць старыя савецкія вокны з вялікай рамай і дзвюма маленькімі форткамі. Вядома, ім можна паставіць у віну шмат чаго — і неабходнасць уцяплення, і перыядычнага фарбавання... Але ў чым яны даюць фору ў сто ачкоў, дык гэта ў бяспецы. Акно спраектавана настолькі хітра, што раму і ніжнюю фортку можна адчыніць толькі пасля верхняй. А ручка верхняй форткі знаходзіцца на адлегласці прыкладна 1 метр 90 см ад падлогі. Гэта значыць, што да яе малы зможа дацягнуцца рукой і на дыбачках толькі ў гадоў дзесяць.

На жаль, падчас замены старых вокнаў на сучасныя шклопакеты бацькі не заўжды ўспамінаюць пра тое, што цяпер рамы расчыняюцца на ўсю вышыню праёма. А механізм, які спрацоўвае лёгка, акажацца па зубах і малому. Таму лепш крыху даплаціць, але заказаць вокны са спецыяльнымі замкамі або набыць трымальнікі.

— Дзеці, якім яшчэ не споўніўся год, гінуць часцей за ўсё з-за асфіксіі, выкліканай праглынаннем іншароднага цела, — працягвае Таццяна Гнядзько. — Ці вельмі лёгка здымаюць накрыўку батарэечнага адсека з якойсьці прыгожай цацкі, цягнуць элементы сілкавання ў рот, глытаюць і... зарабляюць цяжкі хімічны апёк. Таму пры выбары забаўкі на батарэйках для малога неабходна разглядаць толькі тыя мадэлі, дзе адсек сілкавання вельмі надзейна замацаваны на шрубах.

А з ліпеня дабавіцца яшчэ адна небяспечная абставіна. За чвэрць стагоддзя мы збольшага адвыклі ад манет, якія зноў увойдуць у наш побыт. А бліскучыя дробныя металічныя кружкі вабяць да сябе дзяцей. Спецыялісты чакаюць з-за гэтага рост дзіцячага траўматызму.

## «МЫ І НЕ ДУМАЛІ, ШТО ДЗІЦЯ ГЭТА ЎЖО ЎМЕЕ»

Вядома, што большасць няшчасных выпадкаў з дзецьмі адбываюцца з-за дрэннага нагляду за імі. Калі ў сям'і ёсць старэйшыя дзеці, то па розных прычынах дарослыя час ад часу перадаручаюць кантроль за малодшым братам ці сястрычкай менавіта ім. Але і іх таксама трэба навучыць правілам назірання.

— Большасць бацькоў, якія перажылі падобныя трагедыі, пасля казалі: мы і не думалі, што наша дзіця на гэта ўжо здольнае, — згадвае Таццяна Гнядзько. — Менавіта таму ў Беларусі з'явяцца цэнтры па навучанні бацькоў стварэнню бяспечных умоў для сваіх дзяцей. Ужо распрацавана спецыяльная праграма. Мяркуецца, што адкрыюцца яны да канца года.

А Міністэрства па надзвычайных сітуацыях запусціла бясплатную мабільную праграму «Дапамога побач». Ратаўнікі будуць вельмі ўдзячныя бацькам, якія ўсталююць яе на смартфоны і планшэты дзяцей. Спампаваць яе можна з Google Play Market. Гэта зрабілі ўжо больш за 5 тысяч чалавек. І водгукі аб ёй карыстальнікі пакідаюць толькі станоўчыя. Акрамя таго, ратаўнікі выклалі на Youtube спецыяльны фільм пра «недзіцячыя гульні», зняты на падставе рэальных гісторый дзяцей, якія трапілі ў бяду па віне дарослых.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Вакол Еўра

# КАЛІ Ў МАРСЭЛІ КІПЕЛІ СТРАСЦІ

## УЕФА ўмоўна дыскваліфікаваў зборную Расіі

**Сёння ў Францыі стартуе шосты дзень чэмпіянату Еўропы па футболе. Два паядынкі адбудуцца ў групе А, там зборная Румыніі сустрэнецца са швейцарцамі (18.55), а Францыя пазмагаецца з камандай Албаніі (21.55). Акрамя таго, пройдзе адзін матч у групе В – зборная Расіі згуляе супраць футбалістаў са Славакіі (15.55).**

Аднак усё больш спартыўная частка чэмпіянату адыходзіць на другі план, бо найперш пытаннем, якое абмяркоўваюць на форумах, і самай папулярнай тэмай навінавых стужак з'яўляюцца беспарадкі, якія прайшлі ў Францыі ў дзень правядзення матча паміж зборнымі Расіі і Англіі. Дакладней, пачаліся яны яшчэ ў ноч на пятніцу, а сваёй кульмінацыі дасягнулі ў суботу. Сутычкі паміж фанатамі дзвюх зборных былі зафіксаваны яшчэ да пачатку паядынку. Месцам сутыкненняў стаў стары порт Марсэля, пазней беспарадкі перанесліся і ў чашу стадыёна. Рэакцыя футбольных улад не прымусіла сябе доўга чакаць: УЕФА адкрыў дысцыплінарную справу ў дачыненні да Расіі за масавыя беспарадкі, расісцкія паводзіны і выкарыстанне піратэхнікі. Такія абвінавачванні не сталі адмаўляць і расійскія кіраўнікі футбольнай галіны.

*«Былі фаеры, была ракетніца, былі сутыкненні на трыбуне, у гэтым трэба разабрацца. Заўзятары выдатна «хварэлі», але ёсць людзі, якія прыходзяць не на футбол. Іх трэба ідэнтыфікаваць, каб нікуды не ездзілі і не хадзілі. Яны лічаць, што яны «крутыя» для кагосьці, за імі краіна ў 140 мільёнаў, гаспадыня будучага чэмпіянату свету — яны яе няславяць і лічаць гэта нармальным»,* — цытуюць **кіраўніка расійскага футбольнага саюза Віталя Мутко расійскія СМІ**.

УЕФА таксама звярнуў увагу на дрэнную работу арганізатараў з заўзятарамі і нездавальняючую работу мясцовых уладаў і паліцыі. Нагадаем, падчас беспарадкаў пацярпелі больш за 30 чалавек, тым не менш паліцэйскі прэфект дэпартамента Буш-дзю-Рон Ларан Нюньез з такім меркаваннем прадстаўнікоў УЕФА не пагадзіўся.

*— Маштабы прысутных у горадзе сіл паліцыі адпавядалі сітуацыі. Паліцыя дзейнічала хутка і імкліва спыняла інцыдэнты, што дазволіла пазбегнуць сур'ёзнай шкоды для горада. Усяго ў суботу было затрымана восем чалавек, раней у пятніцу мы затрымалі сем. Сярод іх прадстаўнікі розных краін, у прыватнасці брытанцы і расіяне,* — паведаміў Нюньез.

А ўжо ўчора, як і чакалася, Саюз еўрапейскіх футбольных асацыяцый вынес пакаранне за такія паводзіны заўзятараў. Зборная Расіі ўмоўна дыскваліфікавана да канца Еўра-2016 (дыскваліфікацыя будзе прыменена толькі ў выпадку паўтарэння інцыдэнтаў унутры стадыёнаў), а РФС аштрафаваны на 150 тысяч еўра.

*— Пакаранне празмернае, але мы не можам на яго паўплываць. Штраф вялізны, але ў апеляцыі няма сэнсу. Не разумею, прычым тут каманда? Яна не вінаватая, каб яе караць,* — пракаментаваў рашэнне УЕФА Віталь Мутко.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■


**Извещение о проведении 30 июня 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч»**

**Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)**

| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов без учета НДС (начальная цена с учетом деноминации), бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Торговое помещение общей площадью 21,7 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 500/D-708165507 | г. Минск, ул. Немига, 30/1-1 | 1 073 200 000 (107 320) | 100 000 000 |
| 2. | Помещение клуба общей площадью 636,6 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 500/D-708165508 | г. Минск, ул. Немига, 30/1-2 | 16 898 400 000 (1 689 840) | 1 000 000 000 |

**Продавец имущества:** МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч», ул. Короля, 2, АБК, каб. 415, 220004, г. Минск.

**Организатор торгов:** коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:**

победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

дальнейшее использование имущества осуществляется согласно генеральному плану г.Минска;

дальнейшее использование имущества осуществляется с учетом требований Закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь»;

при приобретении права собственности на предмет торгов (продаваемое имущество) покупатель обязуется на протяжении одного месяца подписать охранное обязательство в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь».

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь - «Луч», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 30 июня 2016 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 15.06.2016 по 28.06.2016 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 200-12-65, 226-59-70**
**(МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч»).**



■ За кулісамі

# Алена Чухнова. Свабода і боль «Лэдзі-птушкі»

**Цырк здольны захапляць сваёй магіяй гледачоў любога ўзросту. Тое ж здарылася і з нашай гераіняй. Зразумела яна гэта не адразу, але ў прафесіі змагла знайсці сябе. Паветраная гімнастка на палотнах Алена Чухнова ў Беларускім дзяржаўным цырку працуе ўжо больш за дзесяць гадоў. Паспела не толькі адчуць свабоду палёту пад купалам, але і пакарыць сваім талентам гледачоў у розных краінах. І пасля яе прыезду з міжнароднага фестывалю мастацтваў у Пхеньяне, дзе са сваім нумарам «Лэдзі-птушка» артыстка заваявала золата, мы вырашылі сустрэцца з ёй, каб пагаварыць пра тое, што схавана ад цікаўнага вока публікі.**

## Увага публікі — лепшая ўзнагарода

***— Алена, чаго каштавала вам «золата» ў Пхеньяне?***

— Кожны нумар, які з'яўляецца ў цырку, праходзіць шмат этапаў свайго фарміравання. Мы не проста ствараем яго, а ўдасканальваем, праводзім абкат у гледачоў. І, зразумела, самі выканаўцы за гэты час становяцца больш прафесійнымі. З нумарам «Лэдзі-птушка» на фестывалі я выступала ўжо пяты раз і думаю, што цяпер ён па-сапраўднаму гатовы. Безумоўна, не магу гарантаваць, быццам у далейшым з ім ужо не адбудзецца ніякіх трансфармацый, бо пастаянна з'яўляюцца новыя ідэі і мы знаходзімся ў творчым пошуку. Асабліва не проста, калі думаеш пра ўжо зробленае, жадаеш нешта змяніць, палепшыць. Бывае, начамі не спіш, а потым з рэжысёрам абмяркоўваеш дэталі, акцэнты. Магчыма, мне ўдалося на сёлетнім фестывалі заваяваць золата таму, што свой нумар я ўжо адпрацавала папярэдне на гастролях у некалькіх іншых краінах і ў розных умовах. Не абышлося і без экстрыму. Даводзіцца адаптавацца і прывыкаць да манежа, бо ў кожнага ёсць свая спецыфіка (вышыня, амартызацыя падвескі і г.д.), плюс важны момант, як спрацуешся з асістэнтам. Напрыклад, у Кіеве мне асісціраваў трэнер du Soleil, які выдатна ведае сваю справу і з ім можна працаваць амаль без слоў, ён проста адчувае цябе ў любы момант... Такім вось нялёгкім шляхам нараджаецца тое, што гледачы назіраюць на працягу пяці-дзесяці хвілін, а журы адзначае ўзнагародамі.

**«У цырку, мабыць, усё ж не як у спорце, тут наадварот усе за аднаго. Мы ўмеем шчыра захапляцца іншым чалавекам, радавацца яго перамогам, бо ведаем, як кожны з нас рызыкуе».**

***— Як ствараўся нумар «Лэдзі-птушка»?***

— У першую чаргу, вялікую ролю адыграла ідэя рэжысёра Ганны Барашкавай. Яна той чалавек, які ўмее тонка адчуваць артыста, разумець, што яму падыходзіць па характары, па падачы. І калі працуеш у такім тандэме, то ўсё атрымліваецца. Мне, напрыклад, падыходзіць лірыка, а гэты нумар больш тэмпавы, там я «птушачка такая дзелавая». Калі ўжо ёсць задума, то мы прадумваем элементы і адпрацоўваем іх на зямлі, а таксама падбіраем музыку, робім касцюм. Цяпер у мяне там пёркі, і часта нават пытаюцца, ці не перашкаджаюць яны мне ў паветры выконваць складаныя элементы. Зразумела, пасля кожнага выступлення касцюм патрабуе рэканструкцыі, але эфект ён дае. Як кажуць, трукі трукамі, а гледачам хочацца бачыць шоу, таму імкнёмся гарманічна спалучаць вобразы, элементы, падачу.

***— Дарэчы, рэакцыя публікі ў цырку ў залежнасці ад краіны адрозніваецца?***

— Я думаю, што культура краіны ў многім абумоўлівае тое, наколькі эмацыянальныя яе гледачы. Калі, напрыклад, у Японіі публіка можа на кожны твой пераход у нумары бурна рэагаваць, то вось у Карэі глядач паводзіць сябе больш стрымана. Яны не шкадуюць апладысментаў, аднак для ўсіх яны гучаць аднолькава. Там ніхто не стане ўскокваць са сваіх месцаў і крычаць «Брава!» Еўрапейскія гледачы, вядома, больш разняволеныя і свабодныя ў выяўленні сваіх эмоцый.

***— А што можаце сказаць пра беларускую публіку?***

— У нас публіка цудоўная. Памятаю, баялася выступаць у Маскве, бо там гледачы прыдзірлівыя. І ты думаеш, як выступіць так, каб ім спадабацца, бо людзі не будуць выказваць табе сваё захапленне, калі ім не спадабаецца. Тое ж самае і ў Беларусі. Адметнай рысай мінскай публікі лічу тое, што да нас на прадстаўленні прыходзіць шмат дзяцей. Яны, як вядома, вельмі непасрэдныя ў сваіх рэакцыях на нешта. Бывае, працуеш і ў цішыні чуеш, як нехта з дзяцей услых перажывае за тое, што ты зрабіла абрыў ці нейкі небяспечны элемент.

## Жыццё ў рытме няспыннага палёту

***— Самі што адчуваеце, выконваючы трукі ў паветры?***

— Мне бывае страшна. Здараецца часам не вельмі добра сябе адчуваеш і тады перажываеш, як усё пройдзе. У такіх сітуацыях ідзеш на пэўную рызыку. Але разам з тым пад купалам ты здольны адчуць неверагодную свабоду, палёт. Той жа нумар «Лэдзі-птушка» створаны з разлікам, што будзе паказвацца на цыркавых пляцоўках. Бо ён амплітудны, што патрабуе прасторы і вышыні, каб было відовішча. У Пхеньяне было дзе разагнацца, а вось калі працуеш на невялікім манежы, то пачуццё эйфарыі зусім не тое. Аднак ты проста выконваеш сваю работу, не зважаючы на абставіны. Памятаю, на фестывалі ў Астане было не проста. Там ад асвятляльных прыбораў так нагрэўся купал, што калі я пачала рэпеціраваць, паветра было нібы кіпень. А на Кубе, наадварот, дыскамфорт з-за высокай вільготнасці. Я тады працавала з кальцом, там вільгаць, трэнне, і ў нейкія моманты ты абдзіраеш скуру на целе, але працягваеш радаваць публіку. У нашым цырку цяпер, дзякаваць богу, добрая вентыляцыя, і таму працаваць зручна.

***— Для вашай работы патрэбна, як я разумею, і добрая фізічная падрыхтоўка...***

— Трэніруемся мы кожны дзень. Асабліва варта звяртаць увагу на практыкаванні на расцяжку, на прэс, важна пастаянна трымаць сябе ў тонусе. Не магу сказаць, быццам нешта сабе забараняю, бо быць у форме — для мяне ўжо звыклы стан. Зразумела, я не стану есці за дзве гадзіны перад рэпетыцыяй ці да выступлення, бо тады на палотнах будзе не проста. Але, калі адпрацавала, то магу дазволіць сабе ўсё, чаго пажадаю. Ніякіх дыет не прытрымліваюся. Імкнуся толькі больш вадкасці піць і час ад часу вітаміны для суставаў.

***— Пасля гастрольных паездак у вас ёсць час аднавіць сілы, адпачыць?***

— Гэтым разам у нас быў адзін дзень на адпачынак, а потым зноў праца, рэпетыцыі. Мы пастаянна жывём у такім рытме, бо, калі працуеш, то трэба працаваць. Я асабіста за тое, каб не расслабляцца. Зараз я рэпеціраую ў такім, можна сказаць, «сонным рэжыме», але ўсё роўна гэта спрыяе таму, што калі пачну выкладацца на поўную сілу, то для майго арганізма гэта не стане нечаканасцю і стрэсам.

***— На фестывалях прысутнічае канкурэнцыя?***

— Я з вялікай павагай стаўлюся да працы цыркавых артыстаў. Ведаю, што ў кожнага свая гісторыя і ўсім бывае не проста. І канкурэнцыі не адчуваю. Калі стаю за кулісамі і назіраю за выступленнямі сваіх калег, напрыклад, на фестывалі, то мяне не мучыць думка, быццам бы чыйсьці поспех зніжае мае шанцы на перамогу. Можа, я проста на іншым этапе зараз і таму ўсё так успрымаю. Мы наадварот хвалюемся адзін за аднаго, сябруем, падтрымліваем стасункі па-за рамкамі гастроляў. Свет, ён як манеж, — круглы. Ніколі не ведаеш, дзе і пры якіх абставінах сустрэнешся з людзьмі праз некалькі гадоў. У цырку, мабыць, усё ж не як у спорце, тут наадварот усе за аднаго. Мы ўмеем шчыра захапляцца іншым чалавекам, радавацца яго перамогам, бо ведаем, як кожны з нас рызыкуе, бо па-сапраўднаму любіць сваю работу.



## Цырк дае магчымасць знайсці сябе

***— Існуе для вас у прафесійнай рызыцы нейкая мяжа?***

— Я пакуль што яшчэ не стала мамай і таму, думаю, пасля з'яўлення дзяцей буду больш асцярожнай. Бо, калі ты адказны не толькі за сябе ў жыцці, то становішся ўжо не такім смелым.

***— Памятаеце свой першы прыход у цырк?***

— Упершыню я туды трапіла, калі мы былі з бацькамі на экскурсіі ў Вільнюсе. Той раз сярод мерапрыемстваў быў паход у цырк. Звычайнае шапіто ў цэнтры горада, дзе выступалі ліліпуты. Добра памятаю, што была ў захапленні ад канатаходцаў...

***— Тады і зацікавіліся сваёй цяперашняй прафесіяй?***

— Я пэўны час займалася ў цыркавой студыі, а ўвогуле ў розных сферах шукала сябе. Спявала, танцавала, у тэатральнай студыі займалася, і ў цыркавым мастацтве захацелася паспрабаваць свае сілы. Мне падабалася, што я пастаянна занятая, можа, таму і сёння камфортна працаваць у такім рытме... А потым падчас вучобы ва ўніверсітэце *(Алена скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, аддзяленне эстраднай харэаграфіі. — **Аўт.**)* у нас было заданне рабіць пастаноўку нумароў. Я старалася рабіць нешта сольнае, пад сябе. Тады нават не думала пра цырк. Аднак пасля кастынгу прыйшла сюды ў балетную трупу. Потым на месцы ўжо зразумела, што павінна добра папрацаваць над сабой, каб у мяне ўсё атрымалася і пад купалам. Выхадныя праводзіла ў спартыўнай зале, а калегі мяне падбадзёрвалі. І іх вера мне дапамагла дабіцца сваёй мэты.

***— Сёння вы ўжо больш за дзесяць гадоў працуеце ў Белдзяржцырку. Што далей?***

— Зараз жыву ў чаканні таго, што змагу свой нумар «Лэдзі-птушка» паказаць нарэшце беларускай публіцы. Усё неяк не ўдавалася ў нашых праграмах паўдзельнічаць. Нам абяцаюць, што, магчыма, тое будзе восенню, але калі ўзнікне прапанова паехаць на гастролі яшчэ кудысьці, то, вядома, запланаванае выступленне будзе перанесена. Нам, артыстам, важна гастраляваць. І мне падабаецца асвойваць новыя жанры. Напрыклад, калі цырк быў на рэканструкцыі, я працавала над нумарам з плёткамі, магу ласо круціць. Можа, аднойчы і гэта аднаўлю.

***— Якая вы за межамі арэны ў коле сяброў, сям'і?***

— У маім акружэнні шмат людзей творчых прафесій. Мы запрашаем адзін аднаго на свае выступленні... Муж у мяне не звязаны прафесійна з творчасцю, але ён з музычнай сям'і. І таму мы цудоўна адзін аднаго разумеем. Нават тое, што я ўвесь час у раз'ездах, успрымаем як плюс, бо гэта дае магчымасць адчуць, што сумуеш па блізкім чалавеку. Ёсць жаданне стаць мамай, і спадзяюся, што мне ўдасца сумясціць працу і свае мары. Ведаеце, часам бачыш на гастролях сем'і, дзе муж і жонка цыркавыя артысты і дзіця побач з імі, і гэта захапляе. Думаю, можа, нашы дзеці пойдуць па маіх слядах і тады і ў нас будзе дынастыя! Бо цырк, мяркую, цікавы занятак, які дазваляе свет убачыць і сябе паказаць.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

---

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Нізкарослыя кусцістыя сарты перцу не фармуюць. Гэта абумоўлена тым, што ў іх дастаткова слабыя бясплодныя парасткі**

# ЯК ПРАВІЛЬНА ФАРМІРАВАЦЬ ПЕРАЦ,

## каб паскорыць рост і паспяванне пладоў

### Этап першы — *выдаленне кароннага бутона*

Да пэўнага моманту перац расце ў адно сцябло, але пры дасягненні вышыні 15-20 см (у залежнасці ад сорту) пачынае разгаліноўвацца, утвараючы некалькі галін. На месцы разгалінавання фарміруецца першы кветкавы бутон, які агароднікі называюць каронным.

Яго для лепшага галінавання і развіцця куста варта выдаліць.



### Этап другі — *выдаленне лішніх парасткаў*

Часцей за ўсё расліны фармуюць у два-тры парасткі, пакідаючы самыя моцныя з тых, якія сфарміраваліся з развілкі з каронным бутонам. Астатнія прышчыпваюць — гэта значыць, абразаюць кропку росту, верхавіну.

Як правіла, да гэтага моманту на кусце ўтвараецца ўжо 10-12 лістоў. Пакінутыя парасткі першага парадку называюць шкілетнымі, яны і будуць фарміраваць куст.

Шкілетныя галінкі неўзабаве пачынаюць галінавацца гэтак жа, як асноўнае сцябло, утвараючы «відэльчыкі», у цэнтры якіх фарміруецца бутон.

З такімі разгалінаваннямі абыходзімся аналагічна: пакідаем самыя моцныя парасткі, а слабыя прышчыпваем вышэй кветкавай пупышкі і першага ліста.

*Для даведкі.* Пакідаць адзін ліст на парастках, якія выдаляем, трэба абавязкова, бо ён сілкуе размешчаную пад ім завязь будучага плода.

З кожным наступным разгалінаваннем абыходзімся гэтак жа, прышчыпваючы слабыя парасткі над першым лістком.



На кожным разгалінаванні з'яўляюцца кветкавыя бутоны, а пасля завязі. Іх пакідаюць, а тыя, што вырастаюць у міжвузеллі, выдаляюць. Усяго на адным кусце дастаткова пакінуць 15-25 пладоў.

### Этап трэці — *выдаленне бясплодных парасткаў і ніжніх лістоў*

Рэкамендуецца перыядычна аглядаць куст і выяўляць бясплодныя парасткі, выдаляючы іх. Яны ўтвараюцца ніжэй таго месца, дзе разгаліноўваецца галоўнае сцябло.

Там жа варта выдаляць і лісты, якія ніяк не ўдзельнічаюць у харчаванні завязяў, але зацяняюць пасадкі і высмоктваюць з расліны сокі.

*Парада.* Выдаляйце з куста пашкоджаныя і хворыя лісты, дзе б яны ні раслі. Цана пытання — здароўе ўсёй расліны.

Важна памятаць, што ўтварэнне завязяў, рост і паспяванне пладоў залежаць у першую чаргу ад асвятлення цяпліц. Калі расліне не хапае святла, нават пры багатым цвіценні плады могуць не завязацца.

Таму па меры росту трэба будзе абрэзаць усе лішнія лісты.

Лісце на асноўным сцябле абразаюць, калі першы плод дасягне тэхнічнай спеласці (адпаведнага сорту памеру і формы).

Калі вырасце другі плод, выдаляецца лісце, размешчанае пад ім.

Увага! За адзін раз можна зрэзаць не больш за два лісты!

Аналагічна абыходзімся з лісцем пад усімі астатнімі пладамі, якія спеюць. Але апошняе выдаленне трэба зрабіць прыкладна за паўтара месяца да заканчэння сезона і канчатковай уборкі ўраджаю. На гэты час расліну варта пакінуць у спакоі.

### Этап чацвёрты — *прышчыпка шкілетнай галіны*

Калі на кусце ўтварылася дастатковая колькасць пладоў, паскорыць іх рост дапамагае прышчыпванне кропак росту на асноўных галінах. Расліна перастае расці і марнаваць сілы на новыя завязі, цалкам накіроўваючы іх на ўжо існуючыя.

Гэты працэс таксама павінен быць зроблены за паўтара месяца да меркаванага заканчэння вырошчвання перцу.

---

Даты | Падзеі | Людзі

**15 ЧЭРВЕНЯ**

**1215** год — група феадалаў і духавенства пры падтрымцы рыцарства і гараджан вымусіла англійскага караля Іаана Беззямельнага падпісаць грамату, якая атрымала назву «Вялікая хартыя вольнасцяў» (Magna carta). Гэты дакумент, які гарантуе каралеўскім падданым пэўныя прывілеі і правы, захоўвае ў Вялікабрытаніі законную сілу і па гэты дзень. Грамата складзена на латыні, складаецца з прэамбулы і 63 артыкулаў і ўтрымлівае гарантыі тых прывілеяў і свабод, якія склалі падмурак брытанскай сістэмы кіравання. З 63 параграфаў хартыі найбольш вядомы 12-ы, які забараняе каралю ўводзіць падаткі без згоды падаткаплацельшчыкаў, і 39-ы — ён пазбаўляе караля права арыштоўваць грамадзян і адбіраць іх маёмасць без рашэння суда. За тры стагоддзі пасля 1215 года «Вялікая хартыя вольнасцяў» зрабілася сімвалам абмежавання каралеўскай улады, а з часам стала разглядацца як асноватворны закон краіны. У такім разуменні яна паўплывала на палітычныя і прававыя ідэі ў Амерыцы і выканала галоўную ролю ў каланіяльны перыяд яе гісторыі, у ходзе Амерыканскай рэвалюцыі, пры складанні канстытуцыі ЗША.



**1790** год — нарадзіўся Антоні Плятэр, краязнаўца, археолаг, калекцыянер. У 1856 годзе быў членам Віленскай археалагічнай камісіі. У выніку падарожжаў па Заходняй Дзвіне апісаў помнікі архітэктуры, археалогіі, гістарычныя мясціны, Барысавы камяні. Цікавіўся беларускім фальклорам. Сабраў шмат матэрыялаў з Падзвіння, частку іх перадаў у Віленскі музей старажытнасцяў. Рукапісы захоўваюцца ў бібліятэцы Вільнюскага ўніверсітэта. Памёр у 1862 годзе.

**1923** год — выйшаў першы нумар штомесячнага літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага часопіса «Маладняк». Выдаваўся ў Мінску на беларускай мове да 1932 года. Рэдактары М. Кудзелька (М.Чарот), А. Ажгірэй (А. Вольны), М. Арэхва, У. Ігнатоўскі, М. Зарэцкі, М. Адзінец і інш. На першым этапе (1923 — сярэдзіна 1926) часопіс арыентаваўся на беларускую камсамольска-маладзёжную аўдыторыю, імкнуўся злучыць афіцыйную праграму сацыялістычнага будаўніцтва з нацыянальна-адраджэнскімі матывамі. Нароўні з вершамі, аповесцямі і нарысамі маладнякоўцаў (М. Чарота, А. Бабарэкі, У. Дубоўкі, К. Чорнага, К. Крапівы) друкаваў творы пісьменнікаў старэйшага пакалення (Ц. Гартнага, З. Бядулі, А. Гурло), першыя літаратурныя пробы маладых аўтараў і селькараў.

Было сказана

**Яўгенія ЯНІШЧЫЦ, паэтэса:**
*«Хай хлусіць хітры рот.*
*Вачамі — не падманеш».*

---

# СЁННЯ

## Сонца

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.44 | 17.07 |
| Віцебск — | 4.18 | 21.42 | 17.24 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.34 | 17.07 |
| Гомель — | 4.33 | 21.21 | 16.48 |
| Гродна — | 4.54 | 21.57 | 17.03 |
| Брэст — | 5.04 | 21.48 | 16.44 |

## Месяц

*Першая квадра 12.06–19.06.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

## Імяніны

***Пр.** Ульяны, Івана, Нікіфара.*
***К.** Віолы, Яны, Віта, Вітольда, Лявона.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +26..+28°С | КІЕЎ +25..+27°С | РЫГА +18..+20°С |
| ВІЛЬНЮС +19..+21°С | МАСКВА +22..+24°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +19..+21°С |

---

УСМІХНЕМСЯ

**Жанчыны павінны кіраваць светам. Гэта дасць мужчынам больш часу для таго, каб піць піва і глядзець футбол.**

— У нашым рэстаране самыя лепшыя слімакі!

— Так, учора адзін з іх мяне абслугоўваў.

**«Такога віруса ў мяне яшчэ не было», — сказаў заяц, убачыўшы за камп'ютарам цешчу.**

— Дарагі, адкуль у цябе на штанах гэты светлы волас?

— Напэўна, у трамваі прычапіўся.

— А ці не мае ён дачынення да тваёй бялявай сакратаркі?

— Глупства, я заўсёды здымаю штаны...




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2358.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 чэрвеня 2016 года.